
АКРАЙЧЫК

Вам прынёс сягоння зайчык
Хлеба лустачку, акрайчык.

Ён духмяны, хрупаткі,
Залацісты ўвесь такі.

Дзе раней быў — невядома,
А цяпер акрайчык дома.

Паміж гульняў, паміж справаў
Каштаваць яго цікава.

І хоць час ідзе паволі,
Прамільгне гадок у школе.

Зычым вам — без лішніх слоў —
Дарасці да пірагоў!

Ад аўтараў



# АКРАЙЧЫК

## ЧЫТАНКА ДЛЯ 1—2 КЛАСАЎ

Рэкамендавана Навукова-метадычным цэнтрам вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь

Укладальнікі: Г. Каржанеўская, М. Яфімава



МІНСК «НАРОДНАЯ АСВЕТА» 1995

·ББК 81.2Беи-93
А40
УДК 808.26(075.2)

**Акрайчык:** Чытанка для 1—2-х кл./Уклад. Г. Кар-
А40 жанеўская, М. Яфімава.— Мн.: Нар. асвета, 1995.—
176 с.: іл.
ISBN 985-03-0247-X.

Чытанка складзена з займальных, разнастайных па зместу і форме мастацкіх твораў. Усе яны даступныя для ўспрыняцця малодшых школьнікаў і будуць для іх цікавымі. Значная частка матэрыялу можа быць выкарыстана для выхаванцаў дзіцячых садоў.

**8080260000—017**
**А ———————— 167—95**
**М303(03)—95**

**ББК 81.2Беи-93**

**ISBN 985-03-0247-X**

© Укладанне. Г. Каржанеўская,
М. Яфімава, 1995
© Мастацкае афармленне.
А. А. Іванова, 1995

# Калі я шчаслівы

Мама, мамачка, матуля... У гучанні гэтых слоў чуюцца пяшчота і цеплыня. Калі побач мама, табе радасна і спакойна. Яна і пагуляе з табой, і казку раскажа, і суцешыць. Маці радуецца першаму твайму малочнаму зубку і першаму слову, вядзе цябе за руку спачатку ў дзіцячы сад, потым у школу... І адусюль ты вяртаешся дадому. Дома — твае родныя: бацькі, браты і сёстры. І неяк асабліва ўтульна ў сям'і, дзе ёсць бабуля і дзядуля. Як яны ганарацца табою, песцяць цябе...

«Шануй бацькоў сваіх» — такі наказ дае нам усім кніга Божага слова — Біблія. Ніколі не размаўляй з бацькамі няветліва, груба. Спачувай сябрам-сіротам — тым, у каго няма бацькі ці маці. Крыўдзіць сірот — вялікі грэх.

Там добра чалавеку, дзе яго любяць. Як сказаў адзін маленькі хлопчык, шчасце — гэта калі ўсе дома.





## Калі я шчаслівы

*Ніна Галіноўская*

Клюшка са мной,
Мячык са мной —
Я рухавы.
Сонца са мной,
Кветкі са мной —
Я ласкавы.
Мурка са мной,
Тузік са мной —
Я смяшлівы.
Мама са мной,
Тата са мной —
Я шчаслівы.

Кветкі цягнуцца да сонца, а чалавек да шчасця.
Як ты да людзей, так і людзі да цябе.

## Свята

*Юрась Свірка*

Сёння ў нашай мамы свята,
Падарыў ёй кветкі тата.

Пажадаў ён любай маме
Быць заўсёды самай-самай —

І прыгожай, і шчаслівай,
І вясёлай, і руплівай.

Аж свіціцца мама наша:
Атрымаў пяцёрку Саша.

Пастараўся наш Панаска:
Ён нацёр паркет да бляску.

Пахваліла мама Аду —
У пакоях скрозь парадак.

Тата сам гатуе стравы,
Ён старанны і рухавы.

Прыхінае мама кветкі:
— Дзякуй, бацька!
Дзякуй, дзеткі!

Незабыўная нядзеля,
Мама як памаладзела.

І з усмешкай кажа тата:
— Падарылі мы ёй свята.



## Стасікава кладка

*Міхась Даніленка*

У Стасіка захварэла мама. Баліць горла, цяжка дыхаць.

Мама ляжыць у ложку, а Стасік сядзіць каля акна і чакае доктара, каб маму хутчэй вылечыў.

На дварэ дождж. Шэрае неба. Насупраць пад'езда вялікая лужына. Па ёй скачуць бурбалкі.

З парасонам і з вялікай сумкай выйшла з дому бабулька Настасся Іванаўна — мабыць, сабралася ісці ў магазін. Яна доўга прымервалася, як абысці лужыну. Ступіла раз, другі, паслізнулася і ледзь не ўпала.



Але ўсё ж неяк абышла.

З вуліцы на матацыкле прыехаў Жора. Добра Жору: не страшная яму ніякая лужына...

«А як жа да нас доктар прыйдзе? — ду-

мае Стасік.— І Настасся Іванаўна як будзе вяртацца? Замочаць ногі і таксама захварэюць, як мама».

Хлопчык злазіць з падаконніка, ціха выходзіць у прыхожую, апранае дажджавік з капюшонам. Доўга шукае ён на двары дошку. Знаходзіць, цягне да свайго пад'езда і кладзе на дзве цагліны ўпоперак лужыны.

Пасля праз акно Стасіку відаць, як паціху клыпае з магазіна Настасся Іванаўна. Каля кладкі яна на момант прыпынілася, як бы штось успамінае, потым борздзенька тупае ў пад'езд.

Нарэшце прыходзіць доктар — нізенькі тоўсты дзядзька.

— Вось мы зараз тэмпературу змераем, парашкі выпішам,— гаворыць ён,— і не дадзім хварэць тваёй маме!

Потым доктар выпісвае рэцэпт, развітваецца, і Стасік бачыць, як ён хутка выходзіць з пад'езда, перабягае па кладцы лужыну і спяшаецца ў суседні дом — да другіх хворых.

---

Птушка рада вясне, а дзіця — маці.
Матчыны рукі заўсёды мяккія.
Дзетак узгадаваць — не грыбоў назбіраць.

## Дарагая мамачка

*Леанід Пранчак*

Словы цёплыя знайду
І пра маму верш складу.

Мілая, пяшчотная —
Мамка мая родная.

Светлая заранычка —
Дарагая мамачка.

## Насаджу садок

*Іван Грамовіч*

Сам не ведаю, з чаго яно пачалося. Галава цяжкая, балюча ў грудзях... Побач са мною — мама. Яна не спіць. Схілілася нізка. Спагадлівы позірк, ласкавы выраз твару.

— Можа, лепей, сынок? Можа, лягчэй?

— Дзе яно лепш! Але я цярплю. «Лепш»,— адказваю.

— Можа, паясі, сынок?

«Не»,— ціха шапчу ў адказ. Мне нічога не міла. Папрасіў толькі папіць. Маці дае мне глынуць салодкага ліпавага адвару і ўгаворвае:

— Засні, сынок! Засні!

І раптам яе плечы ўздрыгнулі. «Мама! — кажу я.— Чаго вы плачаце? Не трэба плакаць!» Мацней за боль мне шкада яе, родную, дарагую. Я ўжо тады адчуваў, што ёй усім абавязаны.

— Мама, не плачце,— загаварыў я, набіраючы поўныя грудзі паветра.— Паслухайце, як вырасту... буду дужы. Буду ваду насіць. Мама, як вырасту — насаджу садок. І яблыні, і грушы, і вішні. Вялікі... Толькі для вас! От пабачыце. Ні ў кога такога не будзе. Вялікі, зялёны... Як зацвіце!

Матчына рука дакранулася да маёй шчакі:

— Добра, добра, сынок.

— Насаджу садок,— паўтарыў я...

## З мамай

*Ніна Галіноўская*

З маёй мамай вы знаёмы?
Не?
Шкада, сябры, што не.
Калі мама мая дома,
То заўсёды добра мне.

З мамай кніжка цікавей,
З мамай я заўжды смялей.
З мамай сонейка святлей,
Нават плакаць весялей.

## Якіх слоў не хапае?

*Міхась Гелер*

* * *

Будуюць дамы, засяваюць палі,
У сінім прасторы вядуць караблі,
З цымбал высякаюць іскрыстыя гукі,
І шыюць,
І мыюць
Нястомныя ... .



* * *

— Што, сябры, для жыта трэба?
— Ну, вядома, трэба глеба.
— А для птушкі?
— Вышыня.
— А для казкі?
— Цішыня.
— Ну, а што для весялосці?
— Каб часцей бывалі ... .



Умелыя рукі — памочнікі навукі.

Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота — там пуста.

Прыглядай гасцей, каб хадзілі часцей.

## Будзьце госцем

*Леанід Шырын*

Хто праз брамку
Ўвойдзе ў сад —
Стрэнем
Я,
Дзядуля,
Брат,
Мама,
Тата,
Бабка
І сястрычка Натка.
Забягайце.
Шчыра просім.
Кожны будзе
Нашым госцем.
Сад на ўзгорку,
Ля шашы.
Пачастуем ад душы
Яблыкам,
Чарэшняю,
Бэрай самай лепшаю...

Тых, хто ўлезе
Праз паркан,
Стрэне ў садзе
Наш Палкан.



## Дзень нараджэння

*Ганна Іванова*

Вы ляціце, птушкі,
да нашае дачушкі,
Да новае калыскі,
да любае Аліскі —
бабінай калыханкі,
мамінай спадзяванкі,
татавай запытанкі,
братавай гадаванкі.
Спявайце ад ранку,
пасеўшы на ганку!
А я вам дам:
жменю ячменю,
жыта карыта,
мерку пшаніцы,
вады з крыніцы!
Птушкам — пачастунак!
Дачушкам — падарунак!
Сынкам — пацешка!
— А нам?
— А вам — усмешка!
Насіцеся-хваліцеся,
з усімі дзяліцеся!

## Замаўлянка

*Мікола Чарняўскі*

— Ой, пірог,
ой, пірог,
Не хадзі ты
на парог:
Насця ў доме жыве,
Насця ўміг цябе
Зжуе!
— Ой, пірог,
ой, пірог,
Ты прыйдзі
на мой парог!
Ты не стынь,
Не пытай —
А на стол завітай.
Пад гарачы твой бачок
Падсцялю
ручнічок.
Разалью у сподкі —
Што?
Кісель салодкі!
Не аглядвайся ў журбе,
Я адна не з'ем цябе —
Я табой, я табой
Падзялюся з дзятвой!
Ці ты згодзен,
Ці не?
— Кліч дзяцей да мяне!

## Лічылка

*Уладзімір Мацвеенка*

Цеста пыхкала, шаптала:
— Мне у дзежцы месца мала.
Тут замёрзлі мае плечы —
Я хачу хутчэй да печы.
Як спякуся — даставай,
Будзе смачны каравай.
Каравай, каравай, каго хочаш выбірай!

## Разумны аловак

*Даір Слаўковіч*

Тата купіў тры алоўкі. Прыгожыя. Усе тры аднолькавыя.

— Яны — тры браты,— сказаў тата.— Але ніводзін пакуль маляваць не ўмее. Мы іх завострым і паспрабуем навучыць.

Завастрыў тата алоўкі і раздаў: адзін Ірынцы, другі Вераніччы, трэці сабе паклаў.

Узялі паперу, селі за стол. Ірынчын аловак дом намаляваў і дым з коміна. Татаў — зайчыка і лес. А Веранічкін — нічога. Так, рысачкі і крамзулькі розныя.

— Што гэта твой аловак не хоча старацца? — пытаецца тата ў меншай дачкі.

— І сама не ведаю,— адказвае тая.

— Не здольны, відаць, трапіўся,— сказала Ірынка.

— Трэба выкінуць і купіць новы,— парашыла малая.

— Э, не. Так нельга. Ён жа невінаваты. Яго проста яшчэ не вывучылі.

І пачалі тата з Веранічкай удваіх алоўку паказваць. Веранічка трымае аловак, а тата яе руку. І разам выводзяць.

Аловак урэшце зразумеў, чаго ад яго хочуць, і стараецца пачаў. Цяпер вучыла яго ўжо адна дзяўчынка, без таты.

З гэтага дня кожны вечар яны займаліся вучобай. І з кожным днём атрымоўвалася лепш і лепш.

А неяк Веранічка сказала:

— Паглядзі, тата, які разумны мой аловак: ужо ўмее мячык і грыбок маляваць. А хутка і елачку намалюе.

## Змей лятаў

*Мікола Чарняўскі*

Каляровы папяровы змей лятаў.
З-пад аблокаў вечаровых вы-гля-даў:
дзе Міхаська-бегунок,
дзе Адаська-вертунок,
дзе Настуся-балаўніца,
дзе Дануся-працаўніца?
Ці чытаюць,

ці гуляюць,
ці сядзяць,
ці памагаюць?
Калі ж рана леглі спаць,
у гульню —
не браць!

## Татава аўтаручка

*Мікола Гіль*

Сеў тата пісаць — а ручка не піша. Ён яе і трос, і чарніла нанова набіраў — не піша і ўсё. Гукнуў тады Максімку:

— Сынок, ты маёй ручкі не чапаў?

— Не, тата, не чапаў...

— Такая харошая ручка была! Прыйдуць мама з бабуляй, трэба будзе ў іх спытаць, мо яны бралі ды незнарок сапсавалі... А ты, сынок, ідзі гуляй.

Максімка паволі пайшоў у свой пакой і гэтак жа паволі зачыніў за сабой дзверы. Тата схіліўся над сталом. Ды неўзабаве Максімка зноў прыйшоў і дакрануўся да татавага пляча:



— А калі мама тваёй ручкі не брала?

Тата ўважліва па-

глядзеў на сына і, нібы аб нечым здагадаўшыся, сказаў:

— Мабыць, бабуля скінула яе са стала.

— А калі і бабуля невінавата? — не адступаў Максімка.

— То тады і не ведаю, на каго думаць,— развёў тата рукамі.— Ты ідзі, гуляй, сынок, а мне працаваць трэба.

Але хлопчык не адыходзіў. Ён пастаяў, памаўчаў, затым зноў спытаў:

— І ты будзеш на іх сварыцца?

— На каго?

— На маму і на бабулю.

Тата ледзь прыкметна ўсміхнуўся:

— Пэўна, буду. Такую добрую ручку сапсавалі.

— Шкада мамы і бабулі...

Максімка ўздыхнуў і моўчкі пайшоў у другі пакой.

Цікаў на стале гадзіннік, адлічваючы секунды і мінуты: цік-так, цік-так... Пад гэта ціканне тату добра працавалася. Ён так захапіўся работай, што не заўважыў, як зноў падышоў сын.

— Не сварыся, тата,— паціху прамовіў ён,— не сварыся на маму і бабулю... Насварыся лепей на мяне...

## Міколка і Маша

*Галіна Каржанеўская*

У Міколкі сястрычка малая,
І яна яму жыць замінае.

То заплача яна не ў пару,
То пабурыць з пясочку гару,
То сандалікі ў Машы зняліся,
То цукеркаю з ёй падзяліся...

Ды без Машы таксама не мёд:
Цішыня — і ніякіх прыгод.

## Чаго крычыце?

*Іван Грамовіч*

У нядзелю ўсе дома. Паселі абедаць. Бацька, дзеці — усе наўкол стала́. А маці заканчвае завіхацца ля газавай пліты і паведамляе, што засмажыла курыцу з салодкай моркаўкай. Чуваць прыемны пах і шыпенне.

— Мне ножку! — заказвае Юля.

— І мне ножку! — крычыць Галя.

— І мне. Мне мама заўсёды дае ножку! — крычыць Толя.

Дзяніс, самы малодшы, сядзіць спакойна і разважае, як дарослы:

— Ну, чаго вы крычыце? Хіба ж курыца сараканожка?..

## Скорагаворка

*Мікола Маляўка*

Рыгорка на падворку
Знайшоў скорагаворку:

Печка-гняздзечка,
Там перапечка.
Ды перапечцы
Горача ў печцы,
І перапечка
Збегла з гняздзечка.

Скажы, скорагаворка,
Ці з'еў цябе Рыгорка?

## Сястрычка вышывала

*Іван Муравейка*

У нашага Іванкі —
Сарочка-вышыванка,
Сарочка-вышыванка,
Вясёлая палянка:

І кветкі расцвітаюць,
І матылькі лятаюць,
І пчолкі, як жывыя,
На кветках мёд
збіраюць.



Сама сястрычка Валя
Сарочку вышывала.
Добрая сястрычка,
Хоць і невялічка.

## Самакат

*Мікола Мятліцкі*

Змайстраваў старэйшы брат
Мне драўляны самакат.
Усміхнуўся, кажа ён:
— Ну, давай, бяры разгон!
Хоць імчаць і страшнавата —
Не магу падводзіць брата.

## Піла

*Павел Марціновіч*

З братам Янкам
Да сняданку
Мы пілуем дровы
Ўранку.
Хоць не ела,
Не піла —
Весела пяе
Піла.
Ну, а што ж яна
Пяе?
Лепш паслухаем яе:
— Хто пілуе

Др-ровы,
Будзе той
Здар-ровы.
Гэта спр-рава,
Бр-ратка,—
Добр-рая зар-радка.

Дзе няма ахвоты, там няма работы.
Дзе гультай ходзіць, там ніва не родзіць.

## «Давай яшчэ разік...»

*Уладзімір Ліпскі*

Просіць Алёнка праспяваць песню «Касіў Ясь канюшыну».

Які з бацькі спявак? Ён дастаў з шафы пласцінкі. Адшукаў песню пра Яся. Алёнка сядзела побач, цярпліва чакала.

— Во яна! — узрадаваўся знаходцы бацька. З вясёлым настроем падхапілася і Алёнка.

Бягуць да радыёлы. Ставяць пласцінку. А потым зноў уладкоўваюцца на канапе.

Хораша спяваюць «Песняры». Алёнка аж не ўсядзела на месцы. Пусцілася ў скокі. То махае рукамі, быццам косіць канюшыну разам з Ясем. То рукі ў бокі і ідзе па крузе.

Некалькі разоў паўтаралі мелодыю. Алёнка ўсё прасіла: «Давай яшчэ разік...»

Потым чыталі казку Васіля Віткі пра вавёрку, у якой забалелі зубкі. Алёнка зноў прасіла: «Давай яшчэ разік...»

Радасна бацьку, што дачка любіць родную песню і родную мову.

## Наша сям'я

*Міхась Пазнякоў*

Раз —
Паперу дастаю!
Намалюю нашу
Дружную сям'ю.

Два —
Аловак прада мной,
Тут жа сцірка
Пад рукой.
Тры, чатыры —
Мама, тата!
Пяць —
Сястрычка Ната!
Шэсць —
Сярэдняя Святлана!
Сем —
Старэйшая Таццяна!
Восем —
Брат малодшы Ясь!

Дзевяць —
Дужы наш Адась.
Дзесяць — я.
Завуся Борам.
Наша ўся сям'я
У зборы.

## Тата з мамай у кіно

*Віктар Шніп*

Тата з мамай у кіно,
Я сяджу, гляджу ў акно.
Мне ісці на двор пара,
Там гуляе дзетвара.
Я збудую дом з пяску
І аддам яго катку,
Што хаваецца ў кусце,
З белым бантам на хвасце.
А як вернуцца дамоў,
Я скажу бацькам ізноў:
— Не хадзіце вы ў кіно,
Наглядзеўся я ў акно!..

### Смяшынка

— Мамачка, дай грошай,— кажа Люся,— я куплю і падару табе сіні кубачак.

— Дзякую, дачушка, але ў мяне ўжо ёсць сіні кубачак.

— Не, мамачка, яго ўжо няма. Я яго ўчора разбіла.

## Каго больш?

*Рыгор Барадулін*

Запыталі аднаго
Хлопчыка малога:
— Любіш больш за ўсіх
Каго?

Не сказаў нічога.
А сястрычка
У адказ,
Пачакаўшы трошку:
— Маму,
Тату,
Кашу,
Квас,
І сябе,
І кошку...

## Нашы продкі

*Сяргей Тарасаў*

Паехалі вучоныя на раскопкі. Асцярожненька здымаюць слой за слоем, нават прасейваюць зямлю, каб нічога не прапусціць. І вось першая знаходка — наканечнік кап'я. З гэтым кап'ём у даўнія часы паляўнічы высочваў дзікага



звера, каб было чым пракарміць сям'ю.

А вунь яшчэ адна патрэбная людзям прылада — сярпок. Стары ён, іржой паедзены, бо даўным-даўно жыта не жаў, без працы занудзіўся. А калісьці ён на славу паслужыў нашым продкам, якія аралі і сеялі на невялікіх лапіках, адваяваных ад лесу.

А там што бліснула — кругленькае, каляровае? Пацерка, прыгожая жаночая пацерка! Разам з іншымі красавалася яна некалі на шыі дзяўчыны. Тая дзяўчына на Купальскае свята песні спявала, шукала чароўную папараць-кветку...

Шмат пра што могуць расказаць старажытныя рэчы. Па іх археолагі чытаюць, як па мудрых кнігах...

## Дзве каскі

*Васіль Хомчанка*

У Андрэйкі ёсць дома дзве каскі. Стаяць яны побач на паліцы.

Адна каска салдацкая. Яе з вайны прывёз дзед. Гэта каска ўратавала дзеда ад смерці. Бег дзед у атаку — ён быў тады яшчэ не дзедам, а маладым хлопцам,— і перад ім выбухнула міна. Секанула асколкамі. Адзін асколак і

трапіў у каску, ударам зваліў салдата на зямлю. Але каска аказалася мацнейшай за асколак. Жывы застаўся салдат.

Другая каска — бацькава. Гэта мірная каска. Андрэйкаў тата працуе на будоўлі брыгадзірам. Шмат дамоў збудаваў ён разам са сваёй брыгадай. У тым ліку і дзесяціпавярховы дом, у якім жыве Андрэйка. Калі хлопчык едзе па горадзе з бацькам, той яму паказвае ў акно: «Вунь мая школа. Палац культуры мой. І твой дзіцячы сад я таксама будаваў».

Бацькава каска ганаровая. Яе называюць залатой каскай і ўзнагароджваюць ёю лепшых рабочых на будоўлях.

Вось гэтыя дзве каскі і стаяць побач. Дзедава — цёмная, сумная, з драпінамі і ўмяцінамі ад куль і асколкаў — напамінае пра баі, калі дзед абараняў ад ворагаў нашу зямлю.

Якое карэнне, такое і насенне.

Калі ёсць дзед, ёсць і абед.

Адзін дасужы, ды не дужы.

Век пражыць — не поле перайсці.

## Дзядуля

*Леанід Пранчак*

Мой дзядуля — ветэран,
Беларускі партызан.
Ён адважна ваяваў,
Перамогу здабываў,
Ад захопнікаў-фашыстаў
Ён Радзіму вызваляў.
Каб квітнеў наш край лясны,
Каб не зналі мы вайны.

## Дыялогі з унучкамі

*Васіль Вітка*

### Парада

— Ты куды?

— На работу, Юлечка.

— Ой, дзядуля, не ідзі. З кім жа я гуляць буду?

— Няможна не ісці. Мае таварышы прыйдуць, а мяне няма.

— А ты ім пазвані, што ты сягоння на пенсіі.

### Маша-англічанка

— Маша, як па-англійску — кот?

— Кэт, а маленькі — кіці.

— А сабака?

— Дог.

— А слон?

— Такіх вялікіх слоў я не ведаю.

## Ступа

— А я ведаю, што такое ступа.
— Што?
— Ракета Бабы Ягі.

## Заказ

— Бабка, нарадзі яшчэ адну ўнучку.

## Першы дзень вясны

— Сёння першае сакавіка, першы дзень вясны!

— А салют будзе? — спыталася Маша.

## Скорагаворкі

*Уладзімір Скарынкін*

* * *

Ёлка сёння ў цёці Лёдзі,
Ёсць на ёлцы ёрш на мёдзе.

* * *

— Смачная з булкай смятанка,—
Стасю сказала Святланка.

* * *

Янка пасярод паляны
Ягады бярэ для Яны.

* * *

Саша шмат рашыў шарад.
Што за гэта? Шакалад.

## Абібок

*Мікола Хамянкоў*

Мама вяжа
Рукавічкі,
Я ваксую
Чаравічкі.
А на кухні
Дзед з бабуляй
Мыюць міскі
І каструлі.
Не сядзіць без справы
Тата —
Робіць санкі-самакаты.
Толькі коцік,
Абібок,
Каля грубкі
Грэе бок.

## Унукі

*Ларыса Геніюш*

Доўга, доўга бег цягнік,
Покуль не спыніўся.
Ён марудзіць не прывык,
Вось і замарыўся.
І прыехалі да дзедкі
Ўнукі-малышы ў адведкі.
Глянцам ззяюць клункі —
Гэта падарункі:

Дзеду — акуляры
Ў дарагім футляры.
Бабулі — хусцінку,—
Вясёлкі часцінку.
Дзед вітае:
— Мае дзеткі!
І бабуля:
— Мае кветкі!
І Тарзанчык: «Гаў-гаў-гаў!»
І кот Мурзік: «Мяў-мяў-мяў!»
Ўнукі цешацца і скачуць,
А бабуля з дзедам плачуць.
— Гэта з радасці, унукі,
Пасля доўгае разлукі.



## Як працуе сэрца

*Таццяна Мушынская*

— Бабуля, а што такое сэрца? — пытаецца малы Петрык.— Калі мы хадзілі ў паліклініку, доктар сказала: «А зараз паслухаем сэрца». Як яна яго слухае?

Усміхнулася бабуля, узяла Петрыкаву далонь і прыклала злева да яго грудзей.

— Чуеш? Нібыта ціхенька стукае нешта... Тук-тук, тук-тук...

Сапраўды, Петрык чуў, што ўнутры яго ёсць нешта жывое і рухавае.

— Гэта і ёсць сэрца, унучак. У кожнай машыны ёсць матор, рухавік. Такі і ў ча-

лавека ёсць матор. Гэта сэрца. Без яго ніхто не зможа пражыць. Сцісні свой кулачок...

Хлопчык паслухмяна сціснуў.

— Які твой кулачок, такога памеру ў цябе і сэрца. У мяне большы, значыць, і сэрца большае.

Петрык задаволены бабуліным адказам. А пасля зноў пытаецца:

— А чаму сэрца так ціхутка стукае?

— Аднойчы вечарам, калі ты ўжо засынаў, за сцяной у суседняй кватэры нехта моцна пачаў стукаць малатком. Ты заснуць не мог. Калі б сэрца моцна стукала, яно б таксама табе ўвесь час перашкаджала. А так працуе сабе паціху, не чуваць яго...

Петрык уважліва слухае. Усё яму цікава, усё хочацца ведаць...

## Ой, як смешна

*Ніл Гілевіч*

Бабка кажа, што калісьці
І яна была малою,
І не ўмела гэтаксама
Адзявацца раніцою.

І касу ёй заплятаці,
І вадзілі ў школу рана,

І кручкі пісала ў сшытку
Па лінеечках старанна.

Ой, як смешна! Наша баба,
Што і чуе вельмі слаба,
І глядзіць праз акуляры,
І бурчыць бесперастанку —
Ў кароценькай сукенačцы
Бяжыць у школу зранку!..

Ой ты, мілая бабуся,
Не сярдуй, што я смяюся...

*(Пераклад з балгарскай)*

### Смяшынка

— Толя, раскажы бабулі верш. Ты ля ёлкі расказваў.

— Без ёлкі не магу, забываюся.

## Малюта, Бора і Дзюдзя

*Алена Лось*

У нашай бабулі невялікая гаспадарка: певень, куры, кураняткі, старая каза Малюта, малады казёл Бора і зусім маленькі парсючок Дзюдзя.

Цэлы дзень Малюта і Бора не даюць бабулі спакою. Здаецца, усе варотцы зачынены, каза і казёл сытыя — аж не, знойдуць усё-такі шчыліну і ўлезуць у бá-

біну капусту. А з капусты казла і дубцом не выганіш — бегае навокал і мэкае, дражніць бабулю. Цягне тады бабуля казла з агарода за рогі, а каза Малюта сама ўжо следам ідзе.

Часам бабуля пасвіць сваю жывёлу каля рэчкі. Сядзіць на беражку, галінкай камароў адганяе, парсючок Дзюдзя каля бабулі ў пясочку качаецца, а казёл з казою альшанік ды вербалоз аб'ядаюць. Ад бабулі нікуды не ідуць. Добра ім разам на беражку.

## Далей ад бяды

*Леанід Шырын*

Покуль бабка
Ля хлява
Козачку даіла,
Я сядзеў
і маляваў
Гену-кракадзіла.
Выйшаў Гена
На ўвесь рост:
Галава
І доўгі хвост.
А зубоў не трэба,
Мусіць.
Яшчэ бабку Гена
Ўкусіць.

## Зубры

*Антаніна Баева*

Летнія травы
Салодкія, росныя.
Ходзяць зубры
Самавітыя, грозныя.

Вось гэта — матуля,
А гэта вось — татка,
А гэта — дзіцця,
Зубраня-немаўлятка.

Малое не слухае
Маці-зубрыху,



Кару ўсё грызе,
Перажоўвае ціха.

Зубрыха хвалюецца:
— Ах ты, малеча!
Паела б лепш лісця,
Капусты заечай.

Навошта табе
Да сасонкі туліцца?
Страсі са спіны
Баравую ігліцу.

А ў зубраня
Зубкі першыя, новыя.
Хрумстае смачна
Карыцу сасновую.

*(Пераклад з рускай)*

## Загадка

*У. Мазго*

Па лясах
Блукае статак
Волатаў
І немаўлятак.
Гэта
Пушчы спадары —
Белавежскія ... .

## Маці

*Рыгор Ігнаценка*

Аднойчы, збіраючы на ўзлессі рыжыкі, я ўбачыў дзвюх кнігавак, якія адна за адною стомлена ішлі па пожні.

Час быў асенні. Дрэвы і хмызнякі апрануліся ў першую пазалоту.

Усе кнігаўкі даўным-даўно паляцелі на поўдзень. А гэтыя дзве чамусьці засталіся.

За большай, якая крочыла ўперадзе, час ад часу ўзнімаючыся ў паветра, ледзьве пасоўвалася са спушчаным левым крылом меншая кнігаўка.

Ішлі кнігаўкі ў адным кірунку, нікуды не збочваючы.

«Маці! — мільганула здагадка.— А кволая, з хворым крылом, яе дзіця».

Магчыма, хітрая ліска схапіла неразумнае птушаня, ды таму пашчасціла вырвацца з зубоў драпежніцы. А мо які нядобры паляўнічы падстрэліў?

Як бы там ні было, толькі ў вырай птушаня ўжо не магло ляцець. Але маці не пакінула ў бядзе сваё дзіцяня. Яна пеша павяла яго ў цёплыя краі.

І вось яны зараз у дарозе. Ідуць разам на той далёкі поўдзень...

## Самая прыгожая

*Васіль Сухамлінскі*

У Савы было малое Савяня. Нязграбнае, шэракрылае. З вялікімі вачамі і вялікім ротам.

Совы лятаюць толькі ноччу. Яны баяцца яркага сонца.

Сава вучыла свайго сына:

— Не вылятай удзень з дупла. Асляпіць цябе сонца — не знойдзеш дарогі дадому.

Савяня было вельмі непаслухмянае. Яно выбралася з гнязда, зажмурылася і паляцела на луг.

Там Савяня расплюшчыла вочы, зірнула на сонца і аслепла. Сядзіць у траве, горка плача. Падыходзіць да яго Чапля.

— Ты чыё? — пытае.

— Я Савяня. Мая мама Сава. Я нічога не бачу. Адвядзіце мяне да мамы.

— Якая ж у цябе мама?

— Мая мама самая прыгожая ў свеце. У яе такія добрыя, ласкавыя, пяшчотныя вочы. Ні ў кога няма такіх вачэй, толькі ў маёй мамы... *(Пераклад з украінскай)*

## Скорагаворка

*Васіль Вітка*

Пайшоў шпак на шпацыроўку,
Знайшоў хустку-кашміроўку.
А шпачыха завязала
І нічога не сказала.

Пайшоў шпак на шашу,
Знайшоў шапку малышу.
Харошая шапка!
Дзякуй табе, татка.

## Салодкія сны

*Леанід Шырын*

Ціха, ціха коцік
Спіць,
Сны салодкія ён
Сніць.

Мур-мурлыча
Аж да ранку
Кошка-мама
Калыханку.

— Ну, заснула б
Хоць бы трошкі,
Падрамала б,
Мама-кошка...

А чаму не спяць
Матулі?
Дзеці кажуць:
— Мы ўжо чулі.

Дзецям сон салодкі
Самы
Аддаюць заўсёды
Мамы.

### Смяшынка

— Дзед, чуеш?

— Не. А што?

— Наш кот заснуў, а матор выключыць забыўся.

## Мама

*Васіль Хомчанка*

Сяргейку прывезлі ў вёску. Там ён пабег на лужок, дзе хадзіла карова Рагуля з маленькім гарэзлівым бычком.

— Здароў, белалобы,— павітаўся Сяргейка.

А той узбычыў лабастую галаву і пайшоў на хлопчыка.

— Букацца хочаш? — спытаў Сяргейка і, нагнуўшыся, выставіў наперад сваю галаву.— Давай.

Белалобы пабаяўся букацца, павяр-

нуўся і пабег ад Сяргейкі. Сяргейка — за ім. Але не дагнаў і схаваўся за кусцік. Бычок туды-сюды, а Сяргейкі няма.

— Не знайшоў! Не знайшоў! — закрычаў Сяргейка і выскачыў з-за куста.— Цяпер ты хавайся.

Ён закрыў рукамі вочы, а бычок — бягом у хмызняк. Сяргейка знайшоў яго адразу і застукаў:

— Бачу, вылазь!

А белалобы не можа выбрацца з хмызняку — забраўся аж у самы гушчар.

— Му-му! — паклікаў ён маці.

Рагуля нават не павярнулася на гэты кліч. Скубе сабе траву і скубе.

— Му-му-му! — яшчэ мацней загаласіў бычок.

Тады Сяргейка яму сказаў:

— Ты не так завеш: не му-му, а ма-ма.

— Му-му!

— Мама,— зноў паправіў Сяргейка і з усяе сілы крыкнуў: — Мама!



Гэты кліч пачулі адразу абедзве мамы — Сяргейкава і белалобага. Сяргейкава маці абняла цяля за шыю, а Рагуля штурхнула яго пад бок

пысай. І вывелі белалобага на лужок.
— Вось бачыш,— зарадаваўся Сяргейка,— паклікалі як трэба, мамы і прыйшлі...

## Радасць

*Уладзімір Карызна*

Радуецца дзед,
Калі пастукаецца сусед.
Бабуля не ўседзіць,
Калі ўнучак прыедзе —
Ласункі, што прыхаваны
На зіму,
Нясе яму.
Рады Вова без меры,
Калі прыйдзе
Сябра Валера...
І як гэта добра,
Што спрадвеку
Рад чалавек
Чалавеку!

# Вечарамі казкі баю

Дзед-барадзед прыйшоў да вас, дзеці, не з пустымі рукамі. У яго чарадзейным кошыку шмат чаго прыпасена: песні, забаўлянкі, заклічкі, загадкі, казкі. Усяго нават не пералічыць! Узніклі яны вельмі даўно, калі яшчэ не было кніг. Складаліся спецыяльна для малых і перадаваліся вусна з пакалення ў пакаленне. І, як бачыце, дайшлі да сённяшніх дзён.



## Песенька Дзеда-барадзеда

*Музыка Л. Захлеўнага* *Словы А. Вольскага*

Я хаджу па белым свеце
І гляджу, як вы жывеце.
Калі трэба, памагу,
Бо я ўсё рабіць магу.

Прыпеў:

Хто я? Дзед-барадзед,
Абышоў белы свет,
А цяпер у ціхі час
Завітаў да вас.

З вамі побач буду ўсюды,
Трэба цуды — будуць цуды,
Трэба казка — раз, два, тры,
Вось і казка вам, сябры!

Прыпеў.

Вечарамі казкі баю,
Я ў запасе шмат іх маю.
А як прыйдзе казка ў сне,
Зноў кажыце дзякуй мне.

Прыпеў.

Я хаджу па белым свеце —
Ваш найлепшы сябар, дзеці,
І вядома нават мне,
Што вы бачыце ўва сне.

Прыпеў.

## Калыханкі

Магчыма, ты яшчэ не забыўся, як соладка засынаецца пад маміну ці бабуліну песеньку — пяшчотную, мілагучную. Песенькі гэтыя называюцца калыханкамі. У многіх з іх ґероем з'яўляецца каток. Зусім як чалавек ён закалыхвае малога, распавядае яму казкі-байкі, ідзе на таржок купіць піражок, ловіць рыбку за хвасток... Малым каток падабаецца — ён такі забаўны, гуллівы, з мяккай, як шоўк, шэрсткай. Некалі існаваў звычай: у новую калыску класці ката. Лічылася, што калі каток добра выспіцца ў калысцы, дык і дзіця ў ёй будзе лёгка засынаць і сніць прыемныя сны.

* * *

А каты мае, каты,
У іх шэрыя хвасты.
Прасіліся начаваць,
Нашых хлопцаў калыхаць.

* * *



А ты, коця, не вурчы,
А, Рыгорка, спі, маўчы.
На коціка — варкота,
На Рыгорку — сон-дрымота.

* * *

Ой, люлі-люлі,
Ветры ў полі загулі.
Ехаў каток ды па дровы,
Загарэлася дуброва.
Пайшоў каток ваду насіці,
Стаў дубровушку тушыці.
Ехаў каток ды па сена,
Забалела калена.
Трэба катка ў хату ўзяці,
Каб пеў баінькі дзіцяці.
Ой, люлі-люлі,
Ветры ў полі загулі.

* * *

Спі, Ванюшачка, не плач,
Купім мы табе калач.
Мёдам памажам,
Нікому не пакажам.

* * *

Пайшоў каток на таржок,
Купіў Юрку піражок.
Пайшоў коцік на вулку,
Купіў Юрку булку.
Пайшоў коцік рэпку рваць,
Юрку трэба крэпка спаць.

* * *

Пайшоў каток пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток:

Ці самому есці?
Ці Андрэйку несці?

Пайшоў ён дахаткі,
Памарозіў лапкі.
Памарозіў лапкі,
Палез на палаткі.

Палез бы ён вышай,
Ды баіцца мышай.
А там мышкі дурэлі,
Кату хвосцік аб'елі.

Пачаў коцік плакаць —
Сталі слёзкі капаць.
Не плач, коцік, не вурчы,
Ты, Андрэйка, спі, маўчы.

## Калыскі

У чым спіць малое дзіця? Ну вядома ж, у калысцы. Раней іх называлі яшчэ люлькамі, і яны мала былі падобны на цяперашнія пасцелькі.

Рабілі калыскі з дошак або плялі з лазы, нярэдка калыскай служылі лёгкія драўляныя начоўкі. Бацькі стараліся так прыладзіць калыску, каб яна злёгку гайдалася — і нібы сама закалыхвала дзіця.

На Беларусі былі калыскі трох відаў:



гойданка, зыбаўка, качанка. Гойданка і зыбаўка прымацоўваліся на чатырох вяроўках да столі, толькі па-рознаму. А качанка мела два драўляныя паўкруглыя палазкі, падбітыя лямцам — каб не грукалі.

Гойданкі і зыбаўкі сёння можна ўбачыць толькі ў музеях, а вось качанкі сустрэнеш і зараз. Толькі на выгляд яны сталі больш сучасныя.

## Загадка

*У. Мацвеенка*

Хто бязгучна мякка ходзіць,
Хто без рук павейкі зводзіць?
Не відаць яго нідзе,
А на ложак спаць кладзе.

## Песні, заклічкі, прыгаворкі

### Зайчык маленькі

— Зайчык маленькі,
Чым ты жывенькі?
— Я і сам дзіўлюся,
Чым я жыўлюся.

Пасадзіў капусту
Ні рэдка,
ні густа.
Пайду я рана —
Капуста парвана,
Пайду я позна —
У капусце росна.

## Я гарох малачу

А чу-чу, чу-чу, чу-чу,
Я гарох малачу
На чужым тачку,
На прыгорачку.

Пакацілася зярно
На Марцінава гумно.
Марцін — з мяшком,
Марцініха — з гаршком.

Марцінятачкі-чарцянятачкі
Ўдаганятачкі.
Блінчыкі валочуць,
Есці яны хочуць.

Сонейка, сонца,
Выглянi ў аконца,
Пасвяці нам трошку,
Дам табе гарошку.

Ідзі, ідзі, дожджыку,
Звару табе боршчыку.
Пастаўлю пад елкаю,
Накрыю талеркаю,
Сама пакаштую,
Цябе пачастую.

Слімак, слімак,
Выпусці рожкі,
Дам мукі
На пірожкі.

Божая кароўка,
Што заўтра будзе —
Дождж ці пагода,
Пень ці калода?
Пагода — ляці,
Дожджык — сядзі.

Божая кароўка,
Паляці на неба,
Прынясі нам хлеба.
Чорнага, белага,
Толькі негарэлага.

Коцік-абармоцік,
Доўгія вусікі,
Тоўсценькія лапкі,
Ходзіць без шапкі.

## Забаўлянкі

### Лады, лады, ладкі

*Бяруць ручку дзіцяці, стукаюць далонькамі адна аб адну і прыгаворваюць або спяваюць:*

Лады, лады, ладкі,
Паедзеш да бабкі,
Паедзеш да бабкі
Па цёплую шапку,
Па новыя боты
Харошай работы,
Па цёпленькі кажушок,
Па кілбаску у мяшок.

### Ідзе каза рагатая

*Той, хто забаўляе, растапырвае два пальцы (ногі і рогі казы), перастаўляе іх і злёгку будыкае дзіця.*

Ідзе каза рагатая,
Сядзіць дзіця пузатае,
Каго нападзе, таго забадзе —
Будык, будык, будык!

Ідзе каза рагатая
За малымі дзіцятамі.
Хто кашкі не еў,
Малачка не піў —
Будык, будык, будык!

## Ідзе Бай па сцяне

*Байка-забаўлянка без канца — для капрызных дзетак.*

— Бегаў Бай па сцяне
У чырвоным каптане.
Добрая мая казка ці не?
— Добрая.

— Як табе добрая,
то і мне добрая.

Бегаў Бай па сцяне
У чырвоным каптане.
Добрая мая казка ці не?
— Добрая.

— Як табе добрая,
то і мне добрая.

## Кую, кую ножку

*Стукаюць па пятачцы малога, прыгаворваюць:*

Кую, кую ножку —
Паедзем у дарожку.
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая,
А ножка малая.
Туп, туп,
Па-е-ха-лі!

## Чыкі-чыкі, сарока

*Стукаюць у далоньку дзіцяці і так распаўядаюць:*

Чыкі-чыкі, сарока,
Прыляцела далёка,
Села ў пана на таку,
Меле крупы на муку.
А пан кажа — засяку,
Ў мяне шабля на баку.
— Хоць і шабля на баку,
Ад цябе я уцяку!
Шух-шух, паляцела!



* * *

Чук-чук-чук,
Налавіў дзед шчук,
А баба — плотак
Ды пазвала цётак.

* * *

Тра-та-та, тра-та-та,
Выйшла котка за ката.
За ката катовіча,
За Пятра Пятровіча.

* * *

Ладу-ладу-ладкі.
— А дзе былі? — У бабкі.
— А што елі? — Кашку.
— А што пілі? — Бражку.

Бабулька казала,
Як нас частавала:
— Прыходзьце часцей,
Пачастую ляпей:

Дам вам сыраквашкі,
Бярозавай кашкі.
Піражкоў у маку
І розных прысмакаў.

## Лічылкі

* * *

Раз, два, тры, чатыры,
Кошку грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

* * *

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Выйшаў зайчык пагуляць,
А за зайцам шэры воўк,
Воўк у зайцах знае толк.

* * *

Беглі коні пад мастамі
З залатымі капытамі.
Дзінь-бразь,
Выйдзі, князь!

* * *

Эны-бэны, фіны, лёк,
Сам Пятровіч бліны пёк.
Пёк, пёк, не дапёк,
Схапіў шапку і уцёк.

## Загадкі

1. Што гэта за вочы: адно свеціць удзень, а другое — уночы?

2. Што нас корміць, а есці не просіць?

3. Стукае, грукае, а нідзе не відаць.

4. Цераз палі, цераз лугі спусціліся канцы дугі.

5. На дварэ гарою, а ў хаце вадою.

6. Мяту, мяту — не вымету, нясу, нясу — не вынесу.

7. Гукнеш, дык адгукаецца, ад людзей хаваецца.

8. Ні стуку, ні груку — госць на двары.

9. Прыйшла чорна маці, усіх паклала спаці.

10. Стаіць паненачка ў чырвонай сукеначцы, хто йдзе — паклоніцца.

11. Не агонь, а пячэцца.

12. Нітак многа, а ў клубок не зматаеш.

13. Скручаны, зверчаны, па хаце скача.

14. На адным паваду сто коней павяду.

## Калыханка-хваляванка

*Павел Марціновіч*

Цёмна, ціха
Навакол.
Дрэмле неба,
Дрэмле дол.

Толькі плешчацца
Рачулка,
Быццам спаць ёй
Трохі мулка.



Хвалі коцяцца
Паволі...
Мо і вам
Гуляць даволі?

Гэты сказ
Пачулі хвалі
І ціхутка
Прашапталі:

— То ніякія
Не гулі,
Мы пяшчотна,
Як матулі,
Закалыхваем малых
Плотачак:
«Калых-калых...»

Каб не мы,
Дык ні адна
Не заснула б
Давідна.

## Дажджавая калыханка

*Васіль Жуковіч*

Ночка чорнаю буслiхай
прыляцела на зямлю.
Ходзіць дожджык ціха-ціха,
шэпча песеньку сваю:

«Спіце, пушчы і палеткі,
Спіце, птушкі, мурашы,
спіце, дрэвы, спіце, кветкі,
шу-шу-шу, шы-шы-шы...

Гром заснуў у калясніцы
і маланак не відаць.
Хай усім цудоўна спіцца,
я іду таксама спаць».

### Смяшынка

Бабуля ціхенька распачынае калыханку: «Баінькі, баінькі, куплю Светцы валенкі...»

Святланка падпявае:

— І туфелькі, і туфелькі...

## Ай і ой

*Васіль Вітка*

Ладачкі-ладкі...
А дзе мае тапкі?

Ладачка, пашукай.
— Ай!

Ах ты, непаслушка,
Давай сюды вушка.
Не хачу гуляць з табой.
— Ой, ой, ой!

## Ножкі

*Нэля Тулупава*

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Трэба коніка каваць —
У дарожцы начаваць.
На галінках птушкі,
Жвавыя пяюшкі.
Зорачкі на кветках,
У калысках — дзеткі.

## Коцік плача

*Ганна Іванова*

Плача коцік на кухні,
Ад слёз вочкі апухлі.
— І цацкі Сцяпанку,
І ладкі Сцяпанку,
А мне, беднаму,—
Апсік, апсік, апсік!

## Ехаў Бай

*Максім Танк*

Ехаў казачнік Бай
Цераз сёлы і гай.
Баіць ці не?
— Бай!

Ён пытаўся ў мяне:
— Што даць дзецям у сне?
Баіць ці не?
— Бай!

Я прасіў: дзецям дай
Казку-песеньку, Бай!
Баіць ці не?
— Бай!

Казку, кажа, я дам,
Толькі выберу сам.
Баіць ці не?
— Бай!

А найлепшую з іх
Дам для самых малых.
Баіць ці не?
— Бай!

Казку збаю я ў сне
Тым, хто першым засне.
Баіць ці не?
— Не!

## Казкі

Хто з вас, дзеці, не любіць казак! У іх шмат дзівоснага, незвычайнага. Дрэвы, птушкі, звяры размаўляюць зусім як людзі. А чалавек у казцы можа каменем ці дрэвам стаць, птушкай абярнуцца... Можа быць вялізным, як гара, і малюсенькім, як пальчык. Самыя звычайныя рэчы — дудачка, клубок нітак, грабеньчык ці люстэрка — надзелены ў казках чарадзейнай сілай. Слухаў бы і слухаў!

А колькі цікавых казак прыдумана пісьменнікамі! І народныя казкі, і літаратурныя падобныя тым, што ўсе яны звычайна канчаюцца шчасліва. Дабро, праўда, справядлівасць заўсёды ў іх перамагаюць.

### Як певень з баранам ваўку стра́ху нагналі

Жылі сабе вол, баран, гусь і пеўнік. Надыходзіла зіма, вол і кажа:

— Ведаеце што? Зіма блізка, холад будзе, паставім давайце хату.

Дык тыя на яго напалі:

— Выдумаў чорт ведае што! Стаў сам, калі хочаш. У нас ёсць пер'е, у барана воўна, то і не памерзнем.



— Ну, як сабе хочаце, а я сваё зраблю.

Тыя пайшлі, а вол паставіў хатку, нанасіў сена, саломы і ляжыць сабе як пан. А як надышла зіма з маразамі, прыбягаюць да яго пеўнік, баран і гусь:

— Пусці нас, дзядзечка вол, у хатку, пабойся Бога, такі мароз. Мы памерзнем.

А гусак падняў ножку і кажа:

— Бач, дзядзечка вол, якія ў мяне ножкі чырвоныя-чырвоныя — зараз паадпадаюць.

— Ах вы, гультаі,— кажа вол,— не

пушчу! Як хатку стаўляць, дык няма каму, а як пагрэцца, дык ёсць каму.

Але тыя сталі прасіцца:

— А мой дзядзечка, а мой ты такі, а мой ты сякі, а мой гэтакі!

Пашкадаваў іх вол і пусціў. Пеўнік зараз палез на печ грэцца, гусак, ходзячы па хаце, усё тупае, каб ногі разагрэць, баран ілбом у сцяну лупіць — грэецца, а вол ім есці варыць.

Ажно прыходзіць воўк-разбойнік, адчыняе дзверы... А баран як вытне яму лбом! Гусак давай шчыпаць, вол рагамі калоць, а певень на печы спалохаўся і ўсё крычаў:

— Ку-ка-рэ-ку!

Так воўк ад жаху і асеў! Як панясецца да сваіх ваўкоў-прыяцеляў дый кажа:

— А мае ж вы браткі, мае саколікі, то ж у лесе кавалі хату паставілі — паўнютка кавалёў! Адзін як даў мне молатам, другі — віламі жалезнымі, а трэці давай шчыпцамі ціснуць. А яшчэ адзін недзе з печы крычаў: «Падайце мне яго сюды!» Мала я не абамлеў. Маю шчасце, што той з печы не злез, а так чыста з мяне скуру садраў бы.



# Муха-пяюха

Казка для тэатра

*М. Яфімава*

Удзельнікі: *казачнік, Муха-пяюха, Ваверка, Мышка, Жабка, Заяц, Воўк.*

Муха-пяюха сядзіць на лавачцы, кожны, хто далучаецца, садзяцца адзін за адным.

Казачнік. Жыла-была Муха-пяюха. Мела яна каляску і шэсць камароў. Запрэгла Муха-пяюха камароў у каляску дый паехала на пагулянку. Едзе дарогаю, едзе шырокаю — сядзіць на галінцы Ваверка.

Ваверка. Добры дзень, пані! Як пані зваць-велічаць?

Муха. Я Муха-пяюха. А ты хто?

Ваверка. А я Ваверка-рыжуха, па елках скакуха.

Муха. Сядай, паедзем разам.

Казачнік. Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — бяжыць Мышка.

Мышка. Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

Муха. Я Муха-пяюха.

Ваверка. Я Ваверка-рыжуха, па елках скакуха.

Муха. А ты хто?

Мышка. Я Мышка-піскуха, па паліцах скрабатуха.

Муха. Сядай, паедзем разам.

Казачнік. Едуць яны дарогаю, едуць яны шырокаю — скача Жабка.

Жабка. Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

Муха. Я Муха-пяюха.

Вавёрка. Я Вавёрка-рыжуха, па елках скакуха.

Мышка. Я Мышка-піскуха, па паліцах скрабатуха.

Муха. А ты хто?

Жабка. Я Жабка-рапуха, па сажалках рагатуха.

Муха. Ну тады сядай, паедзем з намі.

Казачнік. Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — бяжыць Заяц.

Заяц. Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

Муха. Я Муха-пяюха.

Вавёрка. Я Вавёрка-рыжуха, па елках скакуха.

Мышка. Я Мышка-піскуха, па паліцах скрабатуха.

Жабка. Я Жабка-рапуха, па сажалках рагатуха. А ты хто?

Заяц. А я Заяц-шарачок, праз дарогу скок-скок.

Муха. Сядай, мы пацяснімся. Разам паедзем.

Казачнік. Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — а насустрач Воўк.

Воўк. Добры дзень панам вяльможным! Як жа вас звацъ-велічаць?

Муха. Я Муха-пяюха.

Вавёрка. Я Вавёрка-рыжуха, па елках скакуха.

Мышка. Я Мышка-піскуха, па паліцах скрабатуха.

Жабка. Я Жабка-рапуха, па сажалках рагатуха.

Заяц. Я Заяц-шарачок, праз дарогу скок-скок. А ты хто будзеш?

Воўк. А я галодны Воўк, зубамі шчоўк. Ну што, папаліся? Усіх з'ем! Усіх праглыну!

Казачнік. Як скочыць Воўк у каляску! Ды нікога не злавіў, бо ўсе з піскам кінуліся хто куды. Паляскаў зубамі галодны Воўк ды ні з чым пайшоў далей.

## Верныя сябры

*Васіль Гурскі*

Жыў у лесе Заяц. Ні з кім не сварыўся, ні з кім не спрачаўся. Блізка ад яго, пад ядлоўцавым кустом, пасяліўся Вожык. Памяркоўны звярок, нікому вока не запарушыў. Пазнаёміліся Заяц і Вожык, пачалі разам гуляць. Убачыла іх Вавёрка і

рассмяялася: такія яны розныя — сябры. Заяц вялікі, імчыцца, нібы вецер. А Вожык — маленькі, павольны, як чарапаха.

— Нядоўга вы будзеце сябраваць,— зацокала Вавёрка.— Лопне ваша дружба пры першай нягодзе, як бурбалка дажджавая.

— Пажывём — пабачым,— сказалі Вожык і Заяц.

Аднаго дня ў лес прыйшла бяда. Галодны Воўк убачыў звяркоў і ўзрадаваўся: адразу з'есць Вожыка, а потым, калі прыбавіцца сілы, дагоніць Зайца.

— Ратуйцеся! Воўк-разбойнік набліжаецца! — трывожна зацокала Вавёрка.

Заяц стаў на заднія лапкі і ўбачыў драпежніка, які прытаіўся ў кустах.

— Уцякай, Вожык! — крыкнуў ён і даў драпака.

У Вожыка ножкі кароценькія — не ўцячы яму, небараку. Таму ён скруціўся ў клубочак, выставіў свае вострыя іголкі і замёр.

— Вось і скончылася ваша дружба! — зацокала Вавёрка.— Сапраўдныя сябры ў бядзе пазнаюцца.

А Воўк ударыў лапай Вожыка і аж заскуголіў ад болю — аб іголкі ўкалоўся.

Тым часам вярнуўся Заяц, каб неяк дапамагчы сябру. Воўк кінуў Вожыка — і

за ім, даўганогім. Заяц зрабіў па лесе круг, другі. Не адстае Воўк, следам імчыцца. Чуваць толькі шумнае дыханне ды цяжкі тупат. І раптам... як заенчыць Воўк, як завые на ўвесь лес! Гэта Вожык кінуўся яму пад ногі, і драпежнік зноў параніў аб калючкі нагу.

Пакачаўся Воўк па зямлі, рану залізаў і неахвотна паплёўся прэч — адступіўся ад звяркоў.

Вавёрка ўсё гэта бачыла. Яна спусцілася з яліны да Вожыка і Зайца, зацокала вінавата:

— Даруйце, што смяялася з вас. Цяпер ведаю, вы — сапраўдныя сябры.

З чужое бяды не смейся.
Сябра за грошы не купіш.
Баязліўцу і корч — мядзведзь.

## Вясёлы ветрык

*Сяргей Тарасаў*

Надыходзіць зіма. Мароз шкліць рэкі і азёры, скоўвае зямлю, а нам загадвае цёпла апранацца. Ціха і павольна падае пушысты снег.

А ці ведаеце вы, сябры, чаму падае снег і адкуль ён бярэцца? Не? Ну, тады паслухайце.

Жылі на свеце тры вятры: тата, мама і сын.

Тата быў самы моцны. Ён сябраваў з маланкамі і громам, узнімаў буры і тапіў караблі, зрываў дахі дамоў, ламаў дрэвы і дзіка гудзеў у комінах. Гэта быў страшны вецер, і ўсе яго баяліся.

Мама была лагодная. Яна не тапіла караблёў, а, наадварот, напінала ветразі, круціла ветракі, а ўвосень любіла танцаваць з апалым лісцем.

Толькі маленькі Ветрык-сын як быццам нічога не рабіў. І ўсе думалі, што ён — гультай. Але гэта толькі здавалася. Ветрыку ўсё хацелася рабіць, ды не хапала сілы, каб падняць буру ці прымусіць круціцца ветракі. Дарослыя не баяліся Ветрыка. Адно бурчалі, калі даводзілася падымаць з зямлі сарваны капялюш.

Затое дзеці вельмі яго любілі. Гэта для іх Ветрык гуляў з флюгерамі на дахах дамоў, круціў прапелеры, а самай цікавай была гульня з папяровымі змеямі.

Праходзіла лета, мінала восень. На двары станавілася холадна і няўтульна, і дзеці амаль не выходзілі з дому. Ветрыку рабілася сумна — не было з кім гуляць. Ён дзьмуў у коміны, як Вецер-тата, але замест гуду атрымліваўся пранізлівы свіст. Тады ён пачынаў гуляць з апалым

лісцем, як Вецер-мама, але гэта хутка надакучала. І рашыў Ветрык выправіцца ў падарожжа.

Доўга-доўга ляцеў ён па бязмежнай прасторы і раптам убачыў горы, а на іх вяршалінах — белыя капелюшы.

Як вы здагадаліся, сябры, гэта быў снег.

Уволю нагуляўся Ветрык са снегам: атрасаў яго з елак і соснаў, зноў абсыпаў дрэвы з камля да макаўкі. Белым віхрам кідаўся з кручы, пакуль не змарыўся. І тады, сеўшы адпачыць, ён успомніў пра дзяцей, якія не гулялі на двары, а хаваліся ў хатах ад марозу.

Ветрык быў зусім малы, але набраў у свае кішэні столькі снегу, што ледзьве падняўся з зямлі. Прыляцеў дадому, пачаў выварочваць кішэні, вытрасаць снег долу.

Спачатку снег падаў павольна, пакрываў зямлю белай коўдрай. А потым заскакаў, закружыўся ў паветры. На вуліцу з шумам і смехам высыпалі дзеці — яны пазналі свайго Ветрыка. І пачалася вясёлая гульня.

Цяпер кожную зіму Ветрык лётае да белых гор, набірае поўныя кішэні снегу і нясе яго дзецям.

## Лясное дзіва

*Мікола Чарняўскі*

Пад гулкі гром і дожджык шапатлівы
Прабегла раптам вестка-навіна:
Працуе атэлье «Лясное дзіва» —
Ад ранку да цямна.
І тут, на ўзлеску,
І ў лясной глушы,
Ля ўсіх ялінак,
Хвой,
Бяроз,
Дубоў
Прымаюцца заказы ад грыбоў
На шапкі,
Шапачкі,
Капелюшы,
Панамкі,
Адмысловыя берэткі —
Фасонаў самых модных,
Самых рэдкіх.

Хто клапатлівы, рупны, лоўкі —
Не прыйдзе ў лета без абноўкі.

Пачуў на золку вестку Баравік:
— Хоць я да ўбораў пышных не прывык,
Але абноўка, мусіць, не пашкодзіць.
І праўду ж кажуць —
Лета надыходзіць...

Каб не спазніцца,
Каб не памыліцца,—
Рашуча, порстка выглянуў з іглíцы.
І ўбачыў, што яго ўжо абагналі:
Страчкі й Смарчкі кучомкі паспраўлялі.

Нібыта ў коле, круцяцца Вавёркі,
Каб дагадзіць, каб не збіраць чаргу:
Бяруць заказы, выдаюць абноўкі —
На іх у рыжых змалку тонкі густ!

Страчкі й Смарчкі ўсміхнуліся
Вавёркам,
І іх кучомкі зніклі за пагоркам.

Сказаў Яловік, ім зірнуўшы ўслед:
— Мне б капялюш такі,
Як меў мой дзед:
Цёмна-карычневы, глыбокі,
Каб з вушамі
Хаваўся ў ім у спёку, пад дажджамі.

— І мне такі, і мне такі ж брылёк,—
Азваўся Падбярозавік здалёк.
— І мне!
— І мне!
— І мне!
За спінай дзесьці
Грыбы загаманілі, быццам дзеці:
Масляк,

Валуй,
Таўстуха,
Махавік
І Падасінавік, прамы, як цвік.
Ён, Падасінавік,
Таўсматы змалку, рослы,
Узяў прымерваць
Капялюш дзівосны.

Таўстуха
Круць ды верць каля люстэрка —
Ёй не пашкодзіць лішняя прымерка.

Да іх маўкліва збочылі са сцежкі
Ваўнянка са Свінухай, Сыраежкі.
Ваўнянка, усміхаючыся міла,
Часопіс «Моды» з дому прыхапіла:
— Хачу берэт, каб мяккі быў і вабны.
— І я ў берэце буду болей зграбнай,—
Свінуха падхапіла нечакана.—
Быць моднаю, напэўна ж, не загана?

Найбольшы клопат, мусіць,
у Лісічак.
Вавёркам верашчаць наперабой:
— Панамкі можна?
— Толькі б да спаднічак
Панамкі пасавалі як адной...
Перад люстэркам модніцы сакочуць,
Нікога блізка падпускаць не хочуць.

З-пад лісця, што ў нізінцы прэла,
Прарваўся Грузд:
— А я хачу сам-брэ-ра!

Цікаўны, не хаваючыся ўглыб,
Звярнуў сюды і Парасонік-грыб.
Прынёс пад пахай у сасоннік
Не парасонік ён, а — соннік.
— Напэўна, спраўдзіцца мой сон —
Набуду новы парасон!
І змоўк раптоўна,
Здзіўлена замёр —
Да атэлье прыдыбаў Мухамор!
Адціснуў з ганка бледную Паганку:
— Не бойся, не з'ядуць тваю панамку!
Ты пачакай, сястрыца, ты не злуй.
Няўжо я горшы, чым жаўцяк Валуй?
Будзе новы капялюш —
Ох, усіх павесялю ж!

Пазней за ўсіх прачнулася Зялёнка —
Да дня з Апенькамі вадзіла карагод.
Да атэлье прытупала спрасонку:
Дзе ўборы тыя?
Дзе грыбны народ?
Як і сяброўка верная Радоўка,
Зялёнка з жалю уздыхала доўга.

Пракапаў дождждык па лістоце зноўку:
«Ты не бядуй, Зялёнка, бо не час,—

Табе я ўвосень прынясу абноўку,
Не горшай будзе,
Будзе ў самы раз!..»

Пад гулкі гром і дожджык шапатлівы
Прабегла раптам вестка-навіна:
Працуе атэлье «Лясное дзіва» —
Ад ранку да цямна...
І я збіраўся, прачытаўшы гэта,
Сабе абноўку заказаць у ім,
Але спазніўся:
Скончылася лета...
Ну што ж, хай будзе
Казка на ўспамін.

## Як рабілі вясёлку

*Яраслаў Пархута*

Пры азярыне між кветак і траў гулялі ў хованкі праменьчыкі. Іх было ажно сем — Фіялетавы, Сіні, Блакітны, Зялёны, Жоўты, Аранжавы і Чырвоны. Раптам праменьчык Фіялетавы сказаў:

— Надакучыла тут. Хачу на другі бераг азярыны!

Абапёрся адным канцом на купіну, выгнуўся дугою, другі канец апусціў на процілеглы бераг і засвяціўся ад радасці.

Убачыў праменьчык Сіні, як брат ягоны раскашуе, і таксама сказаў:

— На той бераг хачу!

Пераскочыў азярыну, далучыўся да Фіялетавага, і ўжо на пару заззялі яны над зямлёю.

Зайздросна стала праменьчыку Блакітнаму, і ён, доўга не думаючы, кінуўся да братоў.

У небе цяпер тры стужачкі каляровыя гарэлі. Праменьчык Зялёны не вытрымаў, шугануў увысь і адтуль гукнуў:

— Гэй, там, на зямлі! Да нас гайда! Тут прасторна! І відаць далёка!..

Праменьчык Жоўты павагаўся, а тады ўзяў і таксама пераскочыў азярыну. І атрымаўся ладны паясок — пяцікаляровы.

«А я хіба горшы?» — падумаў іх брат Аранжавы і кінуўся следам.

У небе ўжо гарэў шасцікаляровы паясок. Бачачы такое дзіва, праменьчык Чырвоны сказаў:

— Браты, а мяне прымеце ў сваю кампанію?

— Прымем! Прымем! — пачуліся галасы.— Не марудзь толькі...

Праз хвіліну ў небе над азярынай павісла незвычайная сяміколерная стужка, радавалася ёй усё жывое на зямлі. А паколькі тая стужка гарэла надзвычай весела, то людзі і назвалі яе вясёлка.

## Неслух

*Аляксей Якімовіч*

На агародзе, за старым плотам, жылі Сланечнік, Кроп і Цыбуля. Памыюцца, бывала, расою, з цёплым сонейкам павітаюцца і пачынаюць адзін аднаму розныя гісторыі расказваць. І пра тое, як сюды, на агарод, трапілі, і пра тое, як з зямлі выраcталі, падымаліся.

Прачнуліся аднойчы рана-раненька, і высокі Сланечнік усклікнуў:

— А ў нас новы сусед!

Прыгледзеліся Кроп і Цыбуля: сапраўды, ляжыць каля плота, у разорцы, штосьці кругленькае, зялёнае, паласатае.

— Мячык гэта,— расчаравана прамовіла Цыбуля.

— І праўда,— падтрымаў яе Кроп.— Відаць, суседская дзяўчынка забылася.

— Давайце спытаемся, мячык ён ці не,— прапанаваў Сланечнік і, сагнуўшыся ў паклоне, прывітаўся: — Добры дзень, сусед. Як цябе завуць?

— Гарбуз,— нясмела адказаў той.

— Чаго ты ў разорцы хаваешся? Да нас ідзі,— паклікала Цыбуля.

— Баюся,— ледзь чутна прашаптаў Гарбуз.

Ён быў яшчэ маленькі і таму ўсяго-

ўсяго на свеце баяўся: і сярдзітай пчалы, і калючага асоту, і нават звычайнага матыля.

— Які ён паласаценькі! — усклікнуў у захапленні Сланечнік.

— Які ён кругленькі! — дадаў Кроп.

— Якое ў яго прыгожае імя! — шчыра пазайздросціла Цыбуля.

Хваляць Сланечнік, Кроп і Цыбуля новага суседа, не нацешацца ім. А ён слухае ды гонару набіраецца. Асмялеў, з разоркі выскачыў:

— Я самы спрытны, я самы дужы! Я і на плот магу залезці!

— Навошта на плот лезці? — дзівіцца Сланечнік.— Няўжо табе з намі сумна?

— Разаб'ешся, — папярэджвае Кроп.— Хіба не бачыш, што ў плоце слупы струхнелыя?

Гарбуз і слухаць не хоча. Ад гонару як на дražджах расце. Учапіўся хвосцікам за штыкетнік і пакарабкаўся наверх.

— Куды ты? — крычыць Кроп.

— Злазь хутчэй,— просіць Цыбуля.— Упадзеш. Вунь які ты тоўсты!

Не слухае Гарбуз суседзяў, лезе на плот і хваліцца:

— Я ўсё магу. Я самы дужы, я самы спрытны!..

І тут падняўся моцны вецер, па агародзе памчаўся. Нахіліліся да зямлі Сланечнік, Кроп і Цыбуля, ад ветру схаваліся. Мінуў іх вецер, на плот наляцеў. Не вытрымалі струхнелыя слупы, паваліўся плот, а за ім — Гарбуз на зямлю грукнуўся. Ды так моцна, што адразу на кавалкі разляцеўся.

## Казка пра зайца

*Таццяна Красікава*

Заяц-шарачок сядзеў на беразе возера, глядзеў у празрыстую ваду і ўздыхаў:

— Чаму ў мяне няма такога пушыстага хваста, як у вавёркі? Чаму ў мяне не такія тоўстыя лапы, як у мядзведзя?

Усім зайздросціў заяц — ваўку, лісе, аленю, нават птушкам.

Надакучыла возеру слухаць зайцавы ўздыхі. Паслала да яг чароўную рыбку, і сказала тая зайцу:

— Бяжы ў лес. Да каго са звяроў дакранешся, на таго і будзеш падобны.



Узрадаваўся заяц. У лес паскакаў. Дакрануў-

ся да вавёркі — і з'явіліся ў яго на вушах кутасікі.

Пабег далей. А насустрач яму мышка. Узяла ў лапкі свой хвосцік і скача, быццам цераз скакалку.

«Мне б такі»,— падумаў заяц. Дакрануўся да мышкі — і адразу ў яго хвосцік вырас, доўгі і тонкі.

Бегаў, бегаў заяц па лесе. Нарэшце сталі ў яго лапы тоўстыя, як у мядзведзя, вочы круглыя, як у савы, на спіне крылы выраслі, на галаве — рогі...

Вырашыў заяц перад сваімі братаміі-зайцамі пакрасавацца. Прыскакаў на паляну. Але як толькі зайцы яго ўбачылі, мігам пахаваліся. І астатнія звяры разбегліся. І птушкі разляцеліся. Ніхто зайца не пазнае.

Вярнуўся заяц да возера і жахнуўся: глядзіць на яго з вады страшыдла крылатае, насатае, рагатае... Задрыжаў ён і хацеў кінуцца наўцёкі, ды тут чароўная рыбка выплыла і пытае:

— Ну што, заяц, цяпер задаволены?

— Дык гэта я?

— А хто ж? Ты! — рыбка махнула хвастом і знікла.

Застаўся заяц адзін. Плача на беразе. Слёзы на зямлю падаюць і цякуць у лес, пра гора зайцава расказваюць.

Пашкадавалі зайца звяры і птушкі. Сабраліся каля возера. Хаця і боязна, а ўсё ж да страшыдла дакрануліся. І зноў стаў ён зайцам-шарачком.

## Бульбінка і вінаград

*Ларыса Шыпуля*

Аднойчы ў Ташкент прывезлі бульбу. Калі ехалі па старой вуліцы, кузаў страсянуўся — і адна бульбінка выпала.

— Ой, ой! — тоненькім голасам закрычала яна.— І так бакі баляць ад доўгай дарогі, а тут яшчэ аб камень стукнулася.

Ніхто не звярнуў увагі на бульбінку. Толькі маленькі хлопчык, які гуляў непадалёку з мячыкам, падняў яе і шпурнуў за плот. І ўпала бульбінка ў сад, на мяккую траву. Агледзелася і бачыць: каля слупка расце вінаград.

— Ого, які ты высокі! — здзівілася бульбінка.— Да цябе не дацягнуцца.

— Хто гэта пішчыць? — пачулася ў адказ.

— Гэта я, бульбінка.

— Адкуль ты тут узялася?

— З Беларусі прыехала. Вельмі стамілася: трэслася ў цягніку, потым у машыне. Цяпер адпачываю.

— А чаму ты такая шэрая, непрыгожая?

— Я толькі зверху шэрая, таму што жыву ў зямлі. А знімеш вопратку, я белая, чысценькая.

Вінаград не паверыў:

— Не, ты шэрая! Не тое, што мы, паўднёвыя расліны. Паглядзі сама: жоўтыя дыні, паласатыя кавуны, я, вінаград, зялёны. Куды табе з намі раўняцца!

Бульбінка падумала і адказала:

— Праўда, вы ўсе прыгожыя. Але без дынь, без кавуноў, без вінаграду можна абысціся. А без бульбы? І бабка, і каша, і дранікі — у нас усё з бульбы. А які смачны боршч ці суп, калі ў ім ёсць хоць адна бульбінка! У каго ні спытай, усе любяць бульбу. А вінаградам ласуюцца пасля, пад'еўшы. Цяпер ты разумееш, хто з нас болей патрэбен людзям?..

## Чароўны прасік

*Уладзімір Ліпскі*

Жыў-быў прасік. Тоўсценькі такі. Зверху чырвоны, як пажарная машына, а спадыспаду белы-белы як снег. Цэлымі днямі ляжаў ён у шафе на палічцы, бо цам нічога не ўмеў рабіць. Не любілі яго цацкі, нават пасміхаліся.

— Прасік-гультасік, пойдзем пагуляем у футбол,— пакліча, бывае, мячык.

— Я не ўмею,— адказвае прасік.

— Абібок, чырвоны бок, давай песні спяваць,— кажа дудачка і пачынае выводзіць вясёлую мелодыю.

Прасік адварочваецца ад яе і ціха бубніць:

— Я не ўмею дудзець.

— А можа са мной — скок-скок у агарод? — запрашае завадная курка.

— Не буду я скакаць з табой,— злуецца прасік. Яму нават крыўдна: хіба не ведае курка, што ў яго няма ног?

Можа, і па сённяшні дзень не любілі б цацкі таўстуна, каб не адзін выпадак.

Засталася аднойчы ў пакоі лялька Жана. Сядзіць адна на падаконніку і плача.

— Чаго ты плачаш? — спытаўся ў яе з палічкі прасік.

— Як жа мне, прасік, не плакаць? Усе на вуліцы гуляюць, а я — дома.

— Чаму ж ты не ідзеш?

— У мяне сукенка мокрая. Я ў ваду ўпала! — яшчэ мацней заплакала Жана.

— Супакойся, я памагу тваёй бядзе.

Прасік надзьмуўся, яшчэ больш пачырванеў.

— Давай тваю сукенку.

Жана падала прасіку мокрую сукенку.

— А зараз,— папрасіў ён,— уключы вось гэтую вілачку ў гэтую разетку.

Лялька так і зрабіла. Прасік спрытна кульнуўся на ляльчына ўбранне і давай разгладжваць. Шыпіць, аж пара з-пад яго ідзе.

Праз некалькі хвілін ён спыніўся і сказаў:

— На, бяры! Толькі выключыць мяне не забудзься!..

Сукенка была такая прыгожая, нібы з магазіна.

— Дзякуй табе, прасік! — узрадавалася лялька.

Яна надзела сукенку, пабегла да цацак і расказала, які выдатны майстар чырвоны прасік.

З таго часу ніхто не крыўдзіў яго. Усе ведалі, што прасік умее рабіць цуд, якога не зробяць ні мячык, ні дудачка, ні завадная курка.

# Слухай родную прыроду

Ты нахіліўся, каб зрэзаць крамяны баравічок, каб сарваць абмыты расой рамонак. Спыніся на імгненне. Паглядзі, які прыгожы той грыбок, што хітра пазірае на цябе з-пад лістка. А танклявы рамонак? Ён зусім як маленечкае сонейка. Над ім трапеча крылцамі матылёк, зумкае нястомная пчала.

А ці сачыў ты калі за аблокамі, за серабрыстымі пераваьчыкамі ручая? Ці ўслухаўся ў плюскат хваль ракі ці возера, у пошум ветрыку, што аб нечым шэпчацца з каласамі? Ці спыняўся, зачараваны песняй жаўрука?

Шмат скажа твайму сэрцу родная прырода, калі ты навучышся слухаць, любіць яе, назіраць за ёй. Бо прырода дорыць нам не толькі незлічоныя багацці, але і красу, якая ўзбагачае душу чалавека. Любіць прыроду — любіць родную зямлю.





## Слухай родную прыроду

*Васіль Жуковіч*

У любую пару года,
у пагоду, непагоду
слухай родную прыроду —
ты пачуеш галасы
таямнічае красы.

З лесам, з нівай залатою
размаўляе ветравей,
сонца-сонейка — з зямлёю,
з цішынёю — салавей,

з небам — рэкі і азёры,
хваля — з ніцаю вярбой...
Як і што яны гавораць,
слухай, сябра любы мой.

## Як вясна зіму прагнала

*Алесь Асіпенка*

Разляглася ў полі зіма, распусціла сівыя космы. Ляжыць — і ні з месца.

Служаць зіме верныя слугі — калючы вецер ды пякучы мароз. Абодва сярдзітыя.

Калючы вецер лісце з дрэў абтрос, траву ў полі высушыў, каб зіме мякка ляжаць было. А пякучы мароз скаваў зямлю і рэчкі лядовымі аковамі. Застаўся ў марозу ды ветру адзін клопат — вартаваць спакой матухны-зімы.

Надакучыла дзецям зіма. Мамы на вуліцу не пускаюць, баяцца, каб не прастудзіліся. Калі ж дазволяць на двор выйсці, дык спачатку так захутаюць, што кроку не ступіш.

Дзе тая вясна затрымалася?

Сталі дзеці вясну гукаць:

— Вясна-красна,
Залатая каса!
Прыходзь, вясна,
З белай хмаркаю
І прыпаркаю,
З травой-муравой,
З птушыным граем —
Мы цябе чакаем,
Вельмі чакаем.

Пачула вясна, прыбегла на край поля. Стала сонейка ўгору падкідаць. Што ні дзень — усё вышэй. Дарэмна стараўся калючы вецер. Стаміўся, а не можа здзьмухнуць сонейка на небакрай. Палез у чараты, прыціх, лагодным зрабіўся.

А мароз наўцёкі кінуўся. Не азіраючыся, аж да Паўночнага полюса бег. Стаў прасіцца ў белых мядзведзяў:

— Пусціце вясну і лета перачакаць!

Махнуў белы мядзведзь лапай:

— Калі ласка! Мы цябе не баімся.

Засталася зіма без слуг. Спаўзла з палявых пагоркаў у кусты, прытаілася. А вясна тут як тут. Вясёлая. Ідзе, кветкі па лузе раскідае.

Заплакала зіма, пытае:

— Чаго ты прыйшла? Хто цябе клікаў?

Адказала вясна:

— Дзеці клікалі. Цяпер я іх забаўляць буду. А ты, бабуля, уцякай.

Нядобра стала зіме. Скончылася яе ўлада. Прыкульгала яна да рэчкі, села на апошнюю крыгу і паплыла ў акіян.

## Вясна ідзе

Засмяялася ў небе сонейка і пачало праменямі лічыць на стрэхах ледзяшы.

— Дзінь-дзінь-дзінь,— як цымбалы, зазвінелі льдзінкі.

Забулькалі пад снегам ручаі. На таполі замахаў крыламі чорны грак.

«Убачыў грака — вясну сустракай»,— кажа прымаўка. Снег у полі пацямнеў, набрак і асеў. На ўзгорках чарнеюць праталінкі. У лесе на дрэвах набухаюць пупышкі, весела звіняць сінічкі на голым вецці, звонка грукае дзяцел на старой асіне. Грукаў, грукаў, аж разбудзіў мядзведзя. Вылез мішка з берлагу, пачухаў за вухам, зажмурыўся ад сонца і зароў на ўвесь лес: «Вясна ідзе!..»

Выскачыў з-пад кусціка маленькі зайка, працёр лапамі вочкі і здзівіўся — лес пацямнеў, елачкі зелянейшыя сталі. Нават маму сваю не пазнаў: скінула яна свой белы кажушок, адзелася ў шэранькую світку і скубе на праталінцы леташні дзяцельнік.

Наўкол усё булькае, звініць і гукае: «Вясна ідзе-е-е!» *Валерый Кастручын*



## Ажылі пралескі

*Паўлюк Пранўза*

Замець не гуляе,
І мароз аслаб.
Раніцою чутна:
Кап... Кап... Кап...

З крышталёвым бляскам
Звоняць капяжы.
Верабейка скача:
— Жыў!.. Жыў!.. Жыў!..

Прыляцелі з поўдня
Спеўныя шпакі,
Зазвінелі ў небе
Жаўранкаў званкі.

На паляне ціхай
У густым бары
Ажылі пралескі —
Весніх дзён сябры.

## Загадка

*М. Пазнякоў*

З-пад снегу выйшла,
Расцвіла,
І так,
Што аж зіма ўцякла.

## Свята мурашак

*Кастусь Кірэенка*

Толькі што сагнала снег. Наўсцяж у лесе, дзе ні ступі, выступае з-пад ног рудая вада.

Але палянкі прасохлі. Сцяжынкі прасохлі. Прасохлі лясныя ўскраіны. І ўсюды, дзе сонца паспела абсушыць зямлю, пачалося свята мурашак.

Як жа не свята? Першы раз, мусіць, пасля зімы мурашкі выйшлі на святло, на сонца.

Што робіцца каля аднае бярозы і на самой бярозе! Ад парэпанага камля, ля якога пачынаецца мурашнік, і да самай вяршыні няма аніводнай галінкі, аніводнай пупышкі, дзе б не сядзелі, не паўзлі, не куляліся мурашкі.

Чаму ж кінуліся яны на бярозу? Чаму так хвалююцца?

Па жылах дрэва пайшоў салодкі сок, і ўсе мурашкі спяшаюцца паласавацца ім. Дзень і ноч смокчуць салодкую вільгаць, што цячэ па ствале бярозы, па яе галінках.

Няспынна шуміць пад бярозаю свята мурашак!

## ЖАЎРУК

*Леў Мароз*

Жаўручок, мой, жаўручок,
Сябар мой вясёлы!
Дзе ж ён, дзе ж ён,
твой куток,
Тут, у полі голым?

Лапік снегу ды дзірван —
Дзе знайшоў прытулак?..
Поўнач скрозь густы туман
Холадам падзьмула.

Ты замоўк...
Ды знік павеў,
Сонца засвяціла —
Зноў чуцён
твой звонкі спеў
Над зямлёю стылай.

## Скорагаворка

*Ніна Галіноўская*

Апранае грак
Чорны-чорны фрак.
Будзе дырыжорам
У сарочым хоры.

## Жаваронachкі, прыляціце...

*Уладзімір Ягоўдзік*

Жаўрукі — найпершыя пасланцы вясны. На Беларусь яны вяртаюцца з выраю ў сярэдзіне сакавіка. Сонца яшчэ не паспела злізаць снег. Раніцою і ўвечары кусаецца мароз. А жаўрукі пяюць ужо, звіняць над полем і лесам, над вёскамі і гарадамі, вітаюць прыход вясны.

Іх у дружнай жаўруковай сямейцы — чатыры родныя браты.

Палявы.

Лясны.

Чубаты.

Рагаты.

Не бойцеся, у апошняга з братоў зусім не страшныя рожкі. Проста ў яго на галоўцы тырчаць пярынкі. Імі не надта напалохаеш драпежнага ястраба. Але жаўручок, як расказваюць старыя людзі, паднімецца з саломінкаю ў неба і спявае: «Пайду ястраба біць! Пайду ястраба біць!..»

Ды вось бяда — саломінка выпадае, і жаўрук каменем ляціць да зямлі. А па дарозе апраўдваецца: «Кій упаў! Кій упаў!..»

Цяжка жаўруку несці на малых крылах званочкі вясны. Але можна дапамаг-

чы ім. Трэба папрасіць маму, каб яна напякла з цеста чубаценькіх пташак. Потым нядзелькаю выйсці на вуліцу, як мага вышэй падкідваць іх угору над сабою і спяваць:

— Жаваронaчкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце!
Бо зімачка надаела,
Усе хлебушкі пераела!

Паспрабуй, мой маленькі сябар. І ты абавязкова, хоць на адну хвіліну, наблізіш прыход вясны-красны на родную зямлю.

## Паілачка

*Валерый Кастручын*

Вечарам хмары над лесам сабраліся, маланка блiснула, забухаў цяжка гром...

Адна кропля — бум! — ударыла па лісточку, пасерабрыла павучковую сетачку і скацілася ў спадачак старой сыраежкі.

Кропля за кропляй — моцны дождж пайшоў, сапраўдны лівень.

Падмачыла портачкі зайчыку, заліло асіную норку, а сыраежка вадой аж да самых краёчкаў напоўнілася...

Вожык ноччу стаміўся, піць захацеў. Шукаў лужыну ды напаткаў па дарозе

старую сыраежку. Напіўся і памчаў далей мышэй лавіць.

Раніцай апусцілася пеначка-аўсянка на зямлю: «Фіць-фіць! Піць-піць!..» Убачыла сыраежку — памачыла дзюбку.

Цудоўная паілачка ў лесе з'явілася!

## Казка пра канарэйку

*Алена Кобец-Філімонава*

Ляцела канарэйка
З дудачкай-жалейкай.
Дудачку згубіла,
Песню не забыла.
Жаласна спявае,
Дудачку шукае.

## Бусел і хлопчык

*Авяр'ян Дзеружынскі*

— Бусел, бусел,
Клёка-клёка,
Дзе ты жыў?
— Я жыў далёка.
За гарамі,
За лясамі,
Там, дзе Ніл,
На поўдні самым.
— Што за Ніл?
— Рака такая.

Нібы мора,
Гаманкая.
А ў тым Ніле,
Хлопчык мілы,
Ёсць страшыдлы-кракадзілы.
— Як жа ты там,
Бусел, жыў?
— Я не жыў —
Усё тужыў.
Дзе б ні быў,
Дзе б ні лятаў,
Родны край
Успамінаў.

## Блакітны буданчык

*Фама Рамашка*

Нечакана з'явілася цёмна-сіняя хмара. Заблісkалі маланкі. Вось-вось пойдзе дождж.

— Дзе ж схавацца? — пытаецца Любачка.

— У ельніку. Там сапраўдны будан,— сказаў тата.

Ля ельніку — лужок. Гойдаюцца на ветры зоркаўкі, рамонкі, званочкі. Мноства кветак. Блакітных, чырвоных, жоўтых. Мацнее вецер. Нізка схіляюцца кветкі. Ля дзяўчынкі зазумкаў чмель. «Небарака — змокне. Дзе ж яму па-

дзецца?» — занепакоілася Любачка. Ды тут жа ўбачыла: чмель схаваўся ў званочку.

Прайшоў дождж. Выглянула сонейка. Зазіхацелі кропелькі вады на траве, кветках. Зноў весела зазумкаў чмель і паляцеў. Загойдаўся званочак, быццам развітваўся з чмялём. Любачка асцярожна дакранулася да званочка і сказала:

— Якая прыгожая кветка! А для чмяля — буданчык.

## Петрусёў гадаванец

*Ядвіга Бяганская*

Неяк вясною дзядзька Вінцэсь прынёс Петрусю маленькае зайчанятка. Пятрусь з радасцю прыняў падарунак і адразу ж пабег па клетку, у якой перад гэтым жыла кульгавая сарока.

— Цеснавата тут,— сказаў Пятрусь свайму новаму гадаванцу,— але затое ніхто цябе тут не пакрыўдзіць. А падрасцеш — выпушчу на волю.

Гадаваў Пятрусь зайчаня па ўсіх правілах. Карміў, паіў, падсцілаў свежай травы. Адно толькі крыўдзіла хлопчыка: зайчанятка баялася яго. Ніколі пры ім не бралася есці, сядзела, забіўшыся ў куточак.

— Ну, чаму ты мне не верыш? Я ж шкадую цябе,— дакараў свайго гадаванца Петрусёк.

Зазелянела на праталінах траўка, вылупіліся з пупышак першыя лісточкі, абазваўся ў небе жаўранак.

«Вынесу зайчанятка ў садок, хай пагрэецца на сонейку»,— падумаў Пятрусь.

Паставіў ён клетку ля ганка, а сам пабег у агарод пашукаць якой-небудзь траўкі. Вярнуўся назад — а клетка пустая, зайчаняці няма. Відаць, дзверцы былі дрэнна зачынены...

Петрусёк ледзь не плакаў ад гора.

— Ён жа зусім маленькі, загіне адзін, без мамы,— бедаваў хлопчык.

— Нічога, сынку, зайчык твой не прападзе. Ён падрос, сам знойдзе сабе спажыву,— суцяшала Петруся мама.

Зайчанятка і праўда не загінула. Да восені яно вырасла і стала вялікім прыгожым зайцам.

## Фіялка

*Клаўдзія Каліна*

Увесну пад старою ліпаю расцвіла маленькая Фіялка. Яна з цікавасцю паглядзела навокал і ўбачыла, што ўсе яе

суседкі яркія і высокія і над імі кружацца прыгожыя матылькі. А да яе, маленькай кветкі, ніхто не прылятаў, і яна самотна цвіла ў густой траве.



— Ах! — жаласна ўсклікнула Фіялка.— Чаму я такая няшчасная? Ні адзін матылёк не можа знайсці мяне. Лепш бы я зусім не цвіла.

І раптам яна пачула прыемнае гудзенне... Гэта Пчала закружылася над ёю і апусцілася на сінія пялёсткі.

— Як ты мяне знайшла? — спытала радасна кветка.— Я ж такая маленькая і непрыкметная!

— У цябе цудоўны пах,— прагула Пчала.

— Няўжо? — здзівілася Фіялка.— Нават лепшы, чым у тых жоўтых?

— Лепшы. Ты самая цудоўная з ранніх кветак. Я буду прылятаць да цябе.

Пчала дакранулася да кветкі, узяла кропельку духмянага нектару і паляцела ў вулей.

І маленькая Фіялка яшчэ пышней расцвіла, павесялела. Яна адчула сябе самай шчаслівай на веснавой зямлі.

## Адуванчык

*Авяр'ян Дзяружынскі*

Адуванчык,
Дзьмухавец,
Кучаравы маладзец.
Стаў ён пры дарожцы
На даўжэзнай ножцы.
Дзьмухнуў вецер —
Адуванчык
Стаў, нібыта
Абарванчык.
Адуванчык,
Дзьмухавец,
Як падстрыжаны хлапец,
Бо на макаўцы
Ў былінкі
Аніводнай
Валасінкі.

## Загадка

*В. Жуковіч*

Ля дарогі — шарык белы.
Вецер дзьме, а шарык цэлы.
А як дзьмухнуць хлапчукі —
Пух ляціць ва ўсе бакі.

У родным лесе і куст родны.

## Шпачынае гняздо

*Міхась Пазнякоў*

За домам, у якім жыве Вадзік, раскінуўся прыгожы стары парк. Праўда, аб тым, што ён стары, нагадваюць толькі чатыры таўшчэзныя ліпы. У маі ўсе дрэвы ў парку апрануліся ў зялёныя абновы, а гэтыя векавыя ліпы самотна пакалыхваюць сухім голлем. У дупле адной з іх пасялілася шпачыная сям'я. І Вадзік любіць гуляць тут, слухаць птушыныя песні.

Аднаго разу, вяртаючыся са школы, Вадзік пачуў, што ў парку працуе бензапіла. «Зразаюць ліпы!» — апякла раптоўная здагадка. І ён кінуўся да любімай мясцінкі.

Так і ёсць. Адна ліпа, напалову струхлелая ўсярэдзіне, ужо ляжала на траве. Двое рабочых завіхаліся каля другой. За ёю стаяла ліпа са шпачыным гняздом.

— Дзядзечкі! — закрычаў Вадзік і паказаў на дрэва.— Вунь тую ліпу нельга спілоўваць. Там, у дупле, жывуць шпакі.

— Няўжо? — здзівіўся старэйшы рабочы.— А нам загад: спілаваць усе чатыры. Заўтра прыедзе трактар карчаваць пні.

— Жывуць! Жывуць! — захваляваўся

Вадзік.— Я ведаю. Шпачыха яйкі выседжвае, а шпак ёй вусеняў носіць.

— Тады вось што,— сказаў рабочы,— бяжы ў дырэкцыю парку. А мы пакуль не будзем чапаць тваю ліпу.

Дырэктар парку выслухаў Вадзіка, пахваліў:

— Малайчына! Дрэва пакінем, пакуль шпакі ў дупле. А як адляцяць у вырай, спілуем. Старыя вельмі ліпы. Баімся, каб самі не паваліліся ў буру. Наробяць тады бяды...

## Камень

*Васіль Сухамлінскі*

У лузе, пад густым высокім дубам, шмат гадоў бруілася крынічка. Яна давала людзям ваду. У цяні каля крынічкі адпачывалі падарожныя.

Аднаго разу сюды прыйшоў хлопчык. Ён любіў розныя пустыя забаўкі.

— А што будзе, калі я вазьму гэты камень ды кіну ў крыніцу? От, мабыць, булькне дык булькне!

Падняў камень, шпурнуў яго ў крыніцу. Булькнула моцна. Хлопчык засмяяўся, пабег і забыўся пра сваю забаву.

Камень упаў на дно крыніцы і заткнуў гарлячок.



Струменьчык вады спыніўся. Крыніца памерла.

Пасохла трава наўкола крыніцы, і дуб засох, бо падземныя раўчукі пацяклі ў іншае месца.

На дубе перасталі віць гнёзды птушкі. Змоўклі іх песні. Сумна зрабілася ў лузе.

Мінула шмат гадоў. Хлопчык стаў дзедам. Прыйшоў на тое месца, дзе калісьці быў зялёны луг, стаяў густы высокі дуб, спявалі птушкі, вабіла ўсіх да сябе халодная празрыстая крыніца.

Не было ні луга, ні дуба, ні птушак, ні крыніцы. Наўкола пясок, вецер падымаў хмары пылу.

— Дзе ж яно ўсё падзелася? — здзівіўся дзядуля. *(Пераклад з украінскай)*

## Мая песня

*Ніна Галіноўская*

Я і рэчцы, і гаю
Гэту песню спяваю:
— Зеляненькі мой гай,
У сяло прыбягай,
Ад гарачага сонца
Ты мяне засланяй.
Рэчка, рэчка, у спякоту
Прыплыві ты да плоту.
Буду плаваць, нырацць,
На пяску загараць.

Не паслухаўся гай,
Кажа:
— Сам прыбягай!
Рэчка шэпча:
— Не, не,
Лепш прыходзь да мяне...

## Частуйся, дзяцел!

*Фама Рамашка*

Юлька ўбачыла ў садзе незнаёмую птушку. Дзядуля сказаў, што гэта дзяцел. Прыгожая і карысная птушка. Дзяцел кожны дзень садзіўся на клён і пачынаў дзяўбці кару.

— Тук! Тук! Тук!

Адпачне крыху. І зноў: тук-тук-тук!

Здаецца, вось-вось zваліцца яго чырвоная шапачка. Дзяцел так захапіўся сваёй работай, што Юлька падыходзіла да дрэва зусім блізка.

— Дзяцел мошак шукае? — пытала дзяўчынка ў дзядулі.

— Э-ге,— усміхаўся дзядуля.— Ласун твой дзяцел. Праб'е дзірачку ў кары і п'е кляновы сок. Ён жа вельмі салодкі.

— Дрэўцу ж балюча,— пашкадавала Юлька.— Я іголкай пальчык укалола і то плакала.

Вырашыла дзяўчынка дапамагчы дрэўцу.

Назаўтра паставіла ля клёна слоік салодкай вады.

— Частуйся, дзяцел. Толькі клён не крыўдзі! — папрасіла Юлька.

## Пра Толіка і пра жабу

*Пятро Васючэнка*

— Вось і дачакаліся дарагіх гасцей,— казала цётка Наста, сустракаючы Толіка з мамай каля веснічак.

А Толік не паспеў павітацца, як адразу спытаў:

— Цётка Наста, у вашым садзе жабы жывуць?

— Жабы? Нашто яны табе, Толічак?

— У тэрарыум пасаджу,— адказаў Толік.

— А што гэта такое? — насцярожылася гаспадыня.

Тут дзядзька Яўген паправіў акуляры і пачаў тлумачыць:

— Гэта такая скрыня з пяском і вадою. У ёй трымаюць дзеля навукі жабаў, трытонаў, яшчарак, розных паўзуноў...

— А божачкі! — жахнулася цётка Наста.

— Было б пра што гаварыць,— спыніла мама цікавую размову.— А ты, Толік, запомні: каб я гэтых жабаў у хаце не бачыла. Іначай павязу назад, у горад. Будзе табе тэрарыум.

Толік не мог уцяміць, чаму дарослыя не любяць жабаў. Яны ж ціхія, не кусаюцца, ловяць розных кузюрак... І пайшоў ён у сад шукаць жабу.

У садзе было цесна ад яблыкаў ды груш, яны ледзьве не пырскалі залацістым сокам. Нават сонца адсюль глядзелася, нібы залатая антонаўка. Адна бяда — жабаў нідзе не відно. Мусіць, пахаваліся.

Зазірнуў Толік пад бервяно і бачыць: яна. Бурая, пляскатая, скрозь у бародаў-

ках. Сапраўдная рапуха. Міргала яна вочкамі ды пазяхала ротам. Горача было беднай.

— Нічога, табе ў тэрарыуме будзе добра,— паабяцаў Толік.

Панёс ён жабу ў хату. Доўга шукаў, дзе б яе схаваць падалей ад маміных вачэй. Нарэшце пасадзіў жабу ў скрыню і заставіў скрыню пад ложак.

— Сядзі ціха,— кажа,— а я пайду табе мух налаўлю.

Усе заняліся сваімі справамі. Мама з цёткай Настай завіхаліся на кухні і не заўважылі, як жаба вылезла са скрыні і паскакала па хаце.

Толік тым часам налавіў поўную жменю мух. Прыйшоў, бачыць — каструля з кампотам стаіць на падлозе. Студзіцца. А ў каструлі жаба плавае. Весела пялёскаецца, лапкамі вяслуе, ырца дае. Хораша рапусе. Быццам яна не ў кампоце, а ў цёплым паўднёвым моры. Толькі мора не салёнае, а салодкае.

Цётка Наста як закрычыць ад такой карціны! У дзядзькі Яўгена аж акуляры зваліліся з носа і пабіліся аб падлогу. А маці моўчкі паглядае то на каструлю, то на Толіка.

Сумелася рапуха, што ўсе вакол яе стоўпіліся. Выбралася яна з каструлі і

паскакала на ганак, а адтуль — у сад.

Што далей было, пра тое нецікава гаварыць. Настрой у Толіка сапсаваўся ўшчэнт. А тут яшчэ дождж пайшоў, шэранькі, нудны. Заплакалі ў садзе дрэвы і кусты, нібы хацелі, каб і Толік пароў з імі за кампанію.

А пасля дажджу выбліснула сонца. Выйшаў Толік у сад, глядзіць — жаба ў лужыне плавае. Няйначай, тая самая. Сцішылася, паглядае на Толіка залацістымі вочкамі і нібыта хоча сказаць: «Не трэба мне вашага кампоту. Не трэба мне ваш тэрарыум. Не саджайце мяне ў цесную скрыню».

Паглядзеў Толік на рапуху і не стаў яе чапаць. Пайшоў сабе далей.

У садзе камарыкі мак таўкуць, павукі плятуць свае цянёты, пчолкі пылок з кветак збіраюць, мурашкі цягаюць трэсачкі па сваіх мурашыных сцежках-дарожках. У кожнага свае клопаты. А ў скрыню нікому не хочацца.

## Не будзіце салавейку!

*Алесь Бадак*

Не будзіце салавейку,
не будзіце!
Не крычыце гэтак моцна,
не крычыце!

Ён уночы нават крышку
не паспаў,
А ўсё песенькі да раніцы
складаў.
Ну, а заўтра на світанку
На рацэ
Ён даваць будзе сябрам сваім
Канцэрт.
І збяруцца там
І пчолкі,
І жучкі,
І камарыкі,
Стракозкі,
Матылькі.
Ох, і песні,
Ох, і песні загучаць!
Як шкада,
Што вы так любіце паспаць!

## Кветкі плачуць

Раніцою бабуля Зося нарэзала на агародзе цэлы жмут півонь. Паставіла іх у гладышыку на стол.

Кветкі былі расянымі, і з іх пачалі падаць на чысты абрус кропелькі вады.

— Бабуля,— заўважыў гэта Андрэйка,— глядзі, яны ж слёзныя, не трэба было зразаць іх, яны ж плачуць...

## Не ўкусіла

*Павел Кавалёў*

Падышла бабуля Наста з унукам Алёшкам да калодзежа. Каля яго стаіць чыёсьці вядро напалавіну з вадою. У вадзе боўтаецца пчолка. Бабуля падставіла ёй пад лапкі палец і вызваліла з вады. Пчолка варухнула крылцамі і паляцела.

Унук пытае:

— Што, укусіла?

— Не...

— А дзякуй сказала?

— Не...

— А ты ж яе выратавала!

## Загадкі

*Ніл Гілевіч*

Праз горы, даліны,
Праз тысячы сёл
З далёкай краіны
Вярнуўся пасол.
Спаважны, чыноўны,
Ён стаў на страсе
У ботах чырвоных,
Каб бачылі ўсе.

* * *

Бліснула, зламалася,
Дзесьці ўміг схавалася,

Ні дагнаць,
Ні след пазнаць —
Толькі водгулле чуваць.

* * *

Залатая бочачка
Уранку пакацілася —
Ні стукату,
Ні грукату,
Не ўпала,
Не разбілася.
Калі ж накрасавалася —
За цёмны лес схавалася.

## Дуб-заступнік

*Максім Валошка*

Злосна жыгалі яркія стрэлы маланак. Навальніца разышлася не на жарт. Здавалася, прарвала неба, буйныя кроплі гулка барабанілі па даху шпакоўні. Шпачаняты Жаўтароцік і Чарнушка сцішана сядзелі ў сваім доміку, баяліся, што вецер сарве домік і ён паплыве ў каламутным вадзяным патоку, а пасля і зусім патоне.

— Вось каб дзядзька-дуб абараніў нас,— загаварыў Жаўтароцік.

— Ён жа так блізка! — ажыла Чарнушка.— І такі магутны!

Нібы пачуўшы праз шум дажджу і

грукат грому галасы шпачанят, дуб зашамацеў старым лісцем і нахіліўся да старой ліпы, на якой вісеў домік Жаўтароціка і Чарнушкі.

У гэты момант бляск маланкі асляпіў птушанят. Вогненная страла, здалося, трапіла ў шпакоўню. Страшэнны грукат грому і трэск дрэва абрынуліся на Жаўтароціка і Чарнушку. Шпачаняты аж зняменелі ад страху. Забіўшыся ў куток, дрыжалі яны, бедныя, да таго часу, пакуль не сціхла навальніца.

Яркае сонца вясёлкава заіскрылася ў дажджавых кропельках. З асцярогаю выглянулі Жаўтароцік і Чарнушка з доміка. Яны не пазналі свайго суседа — дзядзькі-дуба. Ранейшы велікан здаўся ім бездапаможным інвалідам. Неверагодная сіла распалавініла яго, абсмаліла і абламала шмат галін, нібы нажом, успарола моцную кару. Да самай зямлі цягнуўся па ствале востры, страшны сваёй белізной след, пакінуты маланкай.

Вачам сваім не верылі Жаўтароцік і Чарнушка. А калі б маланка ўдарыла ў іх домік?

Радаваліся шпачаняты — засталіся жывыя!

І самотна было — шкада дуба-заступніка.

## Ручаёк

*Васіль Зуёнак*

Ці ты зблізку, ці здалёк
Прыкаціўся, ручаёк?
Дзе ты быў і дзе ты жыў,
З кім гуляў і з кім дружыў?

Адказаў нам ручаёк:
— Я ні зблізку, ні здалёк —
Я з высокай хмаркі,
Што ляцела шпарка
Над палямі, над лясамі
І спынілася над вамі.
Вецер хмарку абярнуў —
Цёплы дожджык сыпануў!

За струменьчыкам струменьчык —
Дзе травінка, дзе каменьчык —
У абгонкі скок ды скок,
І радзіўся ручаёк.

Непаседа-весялун,
Гаманлівы булькатун:
— Буду з вамі я гуляць,
Вам караблікі люляць!

---

Няма смачней вадзіцы, як з роднай крыніцы.

## Скорагаворка

*Васіль Жуковіч*

З горкі-горачкі, дзе грэчка,
Ручаёк прыбег да рэчкі.



## Прыз за цікаўнасць

*Валерый Кастручын*

На высокай сасне было дупло — вавёрчына хатка. Аднаго разу з дупла выглянула вавёрачка: вочкі-гузічкі, вушкі-пэндзлікі.

Убачыла вавёрачка сароку. Вельмі цікава. Трэба паглядзець, куды тая ляціць.

Напалову з дупла вылезла. Якраз матылёк ледзь не на нос сеў. Што за птушка такая?

Вылезла вавёрачка з дупла. Султанчыкам хвост падняла.

Вось грыб заўважыла. Ён на сучку

вісіць, на другім дрэве. Відаць, маці-вавёрка сушыць павесіла. Хітрая, яна ведае: убачыць вавёрачка грыб — абавязкова захоча паласавацца ім.

Сядзіць вавёрачка — на грыб глядзіць. Дабрацца да яго нібыта проста, лапкай падаць. Варта толькі з дрэва на дрэва пераскочыць.

І хочацца, і страшна. Вавёрачка яшчэ ні разу ў жыцці не скакала. Маленькая яна.

Глянула ўніз — быццам бездань перад ёю.

Але ж і грыб вабіць.

«Эх, што будзе!» — адважылася вавёрачка. Зажмурылася — і скокнула.

Прыз — чырвоная шапачка падасінавіка.

За цікаўнасць, за адвагу!

### Загадка

*Д. Бічэль-Загнетава*

Пасярод дарожкі
Шапачка ў гарошкі.
Белую панчошку
Нацягнуў на ножку.
Калі гэта зух-зух,
Памары нам мух-мух!

## Чарнічка

*Артур Вольскі*

У засені сосен,
Дзе мох ды іглічка,
Расла-даспявала
Красунька чарнічка.

Калі на світанку
Не бачыла хмарак,
Расой умывала
Свой кругленькі тварык.

А потым
на сонейку
Плечыкі грэла.
Нібы негрынятка,
Яна загарэла.

Быў друг у чарнічкі —
Зялёны лісточак.
Схаваў ён яе
Ад вавёрчыных вочак.

Складала вавёрка
Грыбы на палічкі,
Але не прынесла
Чарняўкі-чарнічкі.

## Мікіткаў сон

*Лідзія Арабей*

На вуліцы было надта горача. Мікітка скінуў і кашулю, і майку, і нават штонікі, застаўся ў адных трусіках і сандалях, але ўсё роўна не было рады ад гарачыні. Сонца пякло, апальваючы скуру, награваючы сцены дамоў, б'ючы ў шыбы і адсвечваючы ад іх новымі гарачымі промнямі. Было так млосна, што не хацелася гуляць ні ў якія гульні, і хлопчыкі ў двары сядзелі як асалавелыя.

І раптам Косцік, які заўсёды быў здатны на выдумкі, зірнуў на ўсіх павесялела і крыкнуў:

— Давайце абліваццa вадою!

З хлопчыкаў уміг зляцела млявасць, усе ажылі, ускочылі з лаўкі і пабеглі дахаты, па бутэлькі.

Бутэлькі гэтыя былі не шкляныя, а такія, што іх можна было сціскаць рукамі, як гумавыя. У іх налівалі ваду, у корках рабілі дзірачку — і бутэлька-палівачка гатова. Дзеці не раз забаўляліся такім абліваннем, і цяпер, у гарачыню, хіба можна было прыдумаць забаву весялейшую!

Скора хлопчыкі бегалі па двары з тымі бутэлькамі і аблівалі адзін аднаго. Ха-

лодная вада струменем біла ў разгарачанае цела і паўзла, казычучы бок, спіну, да самых трусікаў. І скора хлопчыкі былі мокрыя з ног да галавы. Яны абліваліся б, мусіць, да вечара, каб кожнага з дому не паклікалі абедаць.

Прыбег дадому і Мікітка. Бабка аж рукамі пляснула, убачыўшы такога мокрага ўнука, пачала яго выціраць, потым пакарміла і загадала:

— Спаць! Пасля абеду — ціхі час!

Прывык Мікітка бабку слухацца. Спаць дык спаць. Лёг у свой ложак і ўміг заснуў.

І прыснілася яму, што бегаюць яны з хлопчыкамі па двары і вадою з бутэлек абліваюцца. І так ім весела, так хораша! І раптам — галасок, тоненькі, кволы. Не то скарга, не то песенька:

Не магу я з дзеткамі забаўляцца
І вадой з бутэлечкі абліваცца.
Прырасла я ножкаю да зямлі,
Хоць бы ты, Мікітка,
мяне паліў...

Азірнуўся Мікітка ў сне і бачыць — кветачка, што расла ў іх агародчыку пад акном, апусціла галоўку, абвяла лісточкамі, сагнулася сцяблінкаю ледзь не да зямлі і плача, але плача без слёз. На слё-

зы вада патрэбна, а кветачка ні кроплі вады не мае, усю высушыла пякучае сонца.

І цікава ў сне Мікітку: няўжо кветачка ўмее спяваць, гаварыць? Хіба яна жывая?

А калі прачнуўся, адразу ў двор і пад акно, туды, дзе і праўда расла кветачка. Глядзіць — ну і дзіва! Зусім як у сне — абвяла кветачка, галоўку апусціла, лісточкі вісяць... І ўспомнілася хлопчыку яе песенька.

Пабег Мікітка дадому, набраў поўную бутэльку вады і назад у двор. Нахіліўся да кветачкі і пачаў струменьчыкам ліць ваду пад яе ножку.

Кветачка прагна піла і ўсё ніяк не магла здаволіцца. Мікітка пабег дадому, каб набраць яшчэ вады. Калі з бутэлькай вярнуўся назад, то ўбачыў цуд. Сцяблінка выпрасталася, лісточкі падняліся ўгору, а вясёленькая кветачка глядзела на Мікітку і ўсміхалася. Так, так, усміхалася!

А тут мама з работы ідзе, прысела каля Мікіткі паглядзець — на што ён дзівіцца. Мікітка ў яе і пытаецца:

— Мама, а хіба кветачка жывая?

— Канечне, жывая,— адказала мама.

## Павуцінка

*Ніна Галіноўская*

Хусцінка з павуцінак
Вісіць паміж галінак.
На кожнай павуцінцы
Па кропельцы-расінцы.
Гарацьрасінкі-шарыкі
На сонцы, як ліхтарыкі.

## Загадка

*У. Мацвеенка*

Крышталёвыя каралі
Ранкам на траве ляжалі.
Я сабраць хацела ўдзень,
Глянула — няма нідзе.

## Лета ў серванце

*Мікола Янчанка*

На зіму мы лета ў серванце хаваем. Як? А вось як.

Чэрвеньскім ранкам, яшчэ да сонейка, узнімае нас маці з ложкаў:

— Уставайце, дзеткі, па ягады пойдзем.

Мы ўстаём. Але сон неахвотна адпускае нас.

Нарэшце выходзім з хаты. Збягаем з горачкі да рэчкі і па роснай звілістай сця-

жынцы ідзём да лесу. Свежае, нібы настоенае на туманах і кветках, паветра праганяе сон-дрымоту. Ды і маці падбадзёрвае:

— Хутчэй, хутчэй, дзеткі! Летам збярэш, а зімой як знойдзеш.

* * *

А ўслед за суніцамі ў сасновых барах, па нізкіх мясцінах і вакол балацянак паспяваюць чарніцы.

Чарніцы — цёмныя ягады з сінявата-шызым адценнем. Кіславатыя на смак. І вельмі цікаўныя. Так і глядзяць на цябе сваімі дапытлівымі вочкамі. Нібы пытаюць: «А хто гэта прыйшоў да нас?» І адразу выдаюць сябе.

Каб збіраць чарніцы, дастаткова мець спрытныя рукі і, вядома, вытрымку.

— Ну што ты чарнічнік топчаш, ад купіны да купіны бегаеш! — сярдуе маці.— Гэта толькі здаецца, што на другой ягад больш.







* * *

Следам за чарніцамі ў сярэдзіне ліпеня заружавелі маліны.

Маліннік высечкі і лагчынкі з рэдкім алешнікам выбірае. Маліна — цудоўная ягадка! І колерам, і пахам, і смакам чаруе. Праўда, адшукаць яе не так ужо і лёгка. У рост чалавека ўзняліся густыя-густыя кусты малінніку, хаваючы сваё багацце.

— А вы ціхенька кусцік разгарніце або прысядзьце ды знізу гляньце,— раіць маці.— Знізу відней. Заўважыце коску — за яе і абірайце.

Коску! І сапраўды — доўгая зялёная каса, пацеркамі ягад аздобленая!

* * *

Гулкі жнівень на прасеках і ў лагчынках ажыны высыпаў.

Няма ягад прыгажэйшых за ажыны! Чырвона-чорныя, з таемным бляскам.

І смак у іх асаблівы — салодка-гаркавы. Ажыны — ягады, якія ўмеюць за сябе пастаяць. Галінкі іх шыпамі пакрыты. Колюцца! Каб іх збіраць, не толькі ўменне, але і цярпенне патрэбна. Так і хочацца не рукамі, а чаравікам галіну прыгнуць. Ды маці папярэджвае:

— Асцярожна, асцярожна вакол кустоў хадзіце, і на наступны год сюды заглянем. А не заглянем мы, дык некага іншага гэтая сонечная мясцінка парадуе.

* * *

У жнівеньскім лесе збіраем мы апошні падарунак лета — брусніцы.

Брусніцы — у нашых мясцінах ягада рэдкая. Таму яшчэ загадзя, бываючы ў лесе, прыкмячаем мы брусні́чныя мясцінкі. Звычайна на сонечных ускрайках бароў, вакол высечак. Ярка-чырвоныя, з бялюткімі, не кранутымі сонцам бачкамі вісяць брусніцы паміж цвёрдых цёмназялёных лісцікаў. Гронкамі ля самай зямлі...

Пасля кожнага паходу маці варэнне варыць. А мы пенкамі ласуемся ды слоікі завязваем. Потым у сервант ставім. Так слоік за слоікам хаваецца ў нашым серванце лета.



* * *

Зімовым вечарам уся наша дружная сямейка за сталом збіраецца. Тата батон рэжа, а мама чай па кубках разлівае. Калі разалье, пытаецца:

— Па якія ягады сягоння пойдзем?

— Па суніцы!

— Па ажыну!

— Па маінку! — крычыць маленькая Проська.

— Няхай будзе па-твойму,— кажа маці і прыносіць з серванта слоік з малінавым варэннем. Варэнне густое, цёмна-ружовае, з залацістымі зярняткамі. Увесь пакой умомант напаўняецца малінавым водарам. Намазваем варэнне на лустачкі батона і п'ём чай. П'ём і летнія паходы ўспамінаем.

За акном завіруха шуміць, мароз патрэсквае, а ў нашай хаце лецейка гасцюе.

## Загадка

*В. Карпечанка*

За дрэвы хаваецца,
На крыкі адгукаецца,
Спявае, рагоча,
Сустрэцца не хоча.

## Лета надламалася

*Рыгор Ігнаценка*

Канец ліпеня. Пазней пачало ўставаць сонейка. Ды і грэе яно ўжо не так, як раней.

Большасць птушак прымоўкла. І толькі нямногія зрэдку ўсё яшчэ працягваюць свае спевы. Але што гэта за песні! Куды толькі, здаецца, падзеліся іх весялосць і моц.

Вось на ўзлессі жоўценькая пеначка-вяснянка спявае. Яе песенька гучыць неяк абыякава, ціха. Быццам чалавек за працай штосьці сабе пад нос мармыча.

Лета надламалася. І, як сведчанне гэтаму, не-не ды і мільгане дзе-небудзь у зялёнай кроне бярозы першы жоўты ліст — вястун залатой восені.

## Верабейкі загартоўваюцца

*Мікола Янчанка*

Восень.
Шапкі паскідалі
Клёны сумныя.
Вераб'і аблюбавалі
Вербы шумныя.
Ля крыніцы на карыце
Сабіраюцца
Ды ў халодную вадзіцу
Акунаюцца.
Скокнуць і праз момант нейкі
Абтрасаюцца.
Толькі юны верабейка
Не рашаецца.
Так стаяў бы,
Ды матуля
Дзюбай колкаю
Верабейку падштурхнула
Ў ванну золкую.
Плюх!
Дзе дзелася трывога
Беспрычынная:
— Анічога! Анічога!
Малайчына я!
Так, пакуль мяцельны снежань
Узбунтуецца,
Верабейка як належыць
Загартуецца.

## Дзічка

*Рыгор Ігнаценка*

Паказаў мне яе вясковы пастух. Знаходзілася дрэўца непадалёк ад вёскі ў непралазным драбналессі. Колькі разоў я ў ім быў, а вось жа не трапіла на вочы.

Яблыкі на дзічцы былі буйныя і чырвоныя-чырвоныя. Вісяць на галінках бы тыя ёлачныя шары.

Усю восень я наведваў дзічку. Прыйду, пасяджу на мяккім сіўцы пад дрэўцам і пайду.

Часам я тут заставаў стракатую сойку, траскатуху-сароку, дзятла. А аднойчы нават і вожыка сустрэў. Па якой ён тут справе быў, невядома.

Прыйшоў я пад дзічку і зімою. Як і ўсе дрэўцы навакол, яна стаяла голая, глыбока патанаючы ў пульхным снезе. Толькі — вось дзіва! — слядоў пад яблынькай было значна болей, чым пад якім іншым дрэвам.

Значыць, я быў не адзін. Месячнай ноччу адведаць дзічку на палянку прыбягалі зайцы-белякі, нечага тапталіся панурыя дзікі, скакалі рыжыя вавёркі.

А рагач-лось дык нават ніжнюю галінку адшчыкнуў, каб пераканацца, што дрэўца не замерзла, жывое.

А гэта азначае, што наступным летам яно зноў парадуе ўсё лясное насельніцтва сваімі чырвонымі яблыкамі.

## Жолуд

*Леанід Шырын*

Зімка ўжо
Не за гарамі.
Зайчаняткі
Кажуць маме:

— З дуба ўпаў вунь
Жалудок,
Абмарозіць можа
Бок.

Засмяяўся
Жалудок,
Пад лісток у траўку —
Скок...

Зімку спаў ён
Пад лістком
І ўзышоў вясной
Дубком.

## Зімовы дуб

*Клаўдзія Каліна*

Ідзе лесам Лістапад, лісце сыплецца як град, сякуць дажджы касыя, шумяць

вятрыскі злыя... Дрэвы нізка кланяюцца Лістападу, сцелюць да ног яго пажоўклае лісце. Адляцелі ў вырай птушкі, звяры пахаваліся ў зацішак, апусцелі палі.

Задаволены Лістапад: усё скарылася яму. Усміхнуўся, паслаў на зямлю бледны сонечны прамень, глянуў з-за шэрых хмар лапінкай блакіту. Але што гэта? Вунь на ўзлессі раскінуў веццe магутны Дуб, увесь у мядзянай лістоце.

— Чаму ты не скарыўся мне? — грозна спытаў Лістапад.

— Я зімовы. Таму да вясны буду ў мядзяным убранні.

Угневаўся Лістапад.

— Гэй, вятры буйныя! — паклікаў ён сваіх памочнікаў.— Сарвіце з Дуба яго мядзяны ўбор!

Завылі вятры, зашумелі галіны Дуба.

— Гэй, дажджы халодныя! — гукнуў Лістапад.— Пазбівайце з Дуба лісце!

Секанулі дажджы, забарабанілі па буйным лісці, але Дуб не зварухнуўся.

— Гэй, браце Снежань! — загукаў Лістапад.— Прышлі мне марозу пякучага, завей сыпучых, няхай замарозяць, засыплюць снегам непакорнага!

Прымчалі маразы, прыляцелі завеі, марозілі, снегам секлі, але не скарыўся Дуб.

Спахмурнеў Лістапад і адступіўся ад цара лесу...

Усю зіму стаіць Дуб у сваім мядзяным адзенні. Толькі вясною ненадоўга скідае яго, каб пераапрануцца ў новае, зялёнае. За гэта і называюць яго Зімовым Дубам.

## Захапленне

*Павел Кавалёў*

Зіма выдалася марозная, снежная. Волечка зрэдку выходзіла з дому. І вось у нядзелю, бачу, стаіць каля акна і ўвесь час пазірае на Свіслач. А потым замітусілася, пачала апранацца.

— Ты куды? — пытае маці.

— Зараз, зараз...— Волечка пабегла на кухню, адламала кавалак булкі і сунула ў кішэньку.

— Што рабіць збіраешся? — зноў пытае маці.

— Мне шкада іх,— Волечка хітнула галавой на акно і выскачыла з хаты.

Далей усё высветлілася. Гэта ж качкі зімуюць на Свіслачы. І ў мароз туляцца да берага. Волечка падыходзіць блізка да іх і кідае кавалачкі булкі. Качкі ахвотна хапаюць іх, падсілкоўваюцца.

Вось такое ў Волечкі пачалося захапленне.

## Сярожкавы сябры

*Пятро Сушко*

Па садочку заінелым,
Па сняжку пушыстым, белым
Паміж вішанькаў Сярожка
Пратаптаў сваю дарожку.
Важны ў хлопчыка занятак —
Падсыпаць штодня зярнятак
У птушыныя кармушкі.
Дружаць з ім за гэта птушкі.

## Лясная госця

*Расціслаў Бензярук*

Набліжаўся Новы год. Аднойчы, калі моцна разгулялася мяцеліца, нехта пастукаў у акно. Дзеці адарваліся ад падручнікаў і ўбачылі прыгожую лясную госцю.

— Ёй холадна на марозе,— пашкадавала адна дзяўчынка.— Трэба пусціць у клас, няхай пагрэецца.

— Госці, напэўна, цесна будзе ў нашым класе,— заўважыла настаўніца.

— Давайце запросім яе ў спартыўную залу,— пачуліся галасы.— Там прасторна і цёпла.

Так і зрабілі. Абагрэўшыся, лясная госця засумавала.

— Хочацца мне да сяброўкі бярозы, да рабіны ў чырвоных каралях,— сказала яна.

— Давайце ўпрыгожым яе,— прапанавала настаўніца.

Дзеці павесілі розныя цацкі, цукеркі, яблыкі, а наверсе зорку прымацавалі. Але госця ўсё роўна не радавалася:

— Да мяне часта прыбягалі і заяц-бяляк, і вавёрачка, і ліса, а зараз нікога няма.

— Будуць у цябе і звяркі,— паабяцалі дзеці.

Яны зрабілі маскі зайца, вавёркі, лісы. А калі прыйшлі Дзед Мароз і Снягурка,



пачалі вадзіць карагод, спяваць песні. Развесялілася лясная госця і вырашыла кожны раз пад Новы год прыходзіць да дзяцей.

Думаю, вы здагадаліся ўжо, як завуць лясную госцю.

## Бывай, зіма!

*Мікола Бусько*

Уладарыць сіл няма,
І сказала так зіма:
— Адпачну я на паляне,
Покуль сонейка прагляне,
А пасля пайду туды,
Дзе і ўлетку
Халады.

Прашумеў лес у адказ:
— Ну, бывай!
У добры час!

— Не забудзь,—
Прапелі птушкі,—
Сваю коўдру і падушкі!

# Пра ўсё раскажа школа

Ці ведаеце вы, дарагія першакласнікі, што наша жыццё — нібы лесвіца, дзе многа-многа высокіх прыступак? Гэта маміны рукі, дзіцячы сад, першы клас... Потым іншыя, яшчэ і яшчэ, і кожная ступенька дадасць вам сталасці і розуму.

Школа адкрые перад вамі цудоўны свет ведаў, навучыць і самастойна здабываць іх — з дапамогай кнігі. У школе вы сустрэнеце сяброў, спазнаеце першыя поспехі і няўдачы. Так, так, і няўдачы таксама, толькі іх не трэба баяцца.

Шчаслівага падарожжа па краіне ведаў!





## Хутчэй бы ў школу

*Міхась Валько*

Задаюць пытанні дзеці —
Ім цікава ўсё на свеце:
Чаму сонейка пячэ?
Адкуль ручаёк цячэ?
Куды воблачка плыве?
Дзе зімою рак жыве?..
Кажа дзецям дзед Мікола:
— Вам пра ўсё раскажа школа.

## Адзін пальчык

*Клаўдзія Каліна*

Віця прысеў каля ганка і тонкім дубцом пачаў маляваць на пяску дом. Гэта быў не звычайны дом, у якім жыў ён і ўсе яго сябры. Віця маляваў школу.

Намаляваў у тры рады шмат-шмат акон. Гэта паверхі. На сярэдзіне до-

ма — вялікія дзверы, унізе — прыступкі.

Віця адхінуўся, каб палюбавацца сваім малюнкам, і ўбачыў, як з дзвярэй іхняга дома выйшлі Іра і Галя ў белых фартушках, з букетамі кветак.

Іх праводзіла бабуля.

«У школу»,— падумаў Віця. Цяпер ён застанецца зусім адзін, і не будзе з кім гуляць.

Галя параўнялася з Віцем і прывіталася:

— Добры дзень, Віцечка!

— Добры дзень, малыш,— сказала Іра.

Потым абедзве пахваліліся:

— А мы ў школу ідзём. Не сумуй тут без нас.

І да чаго ж крыўдна стала Віцю. Яму толькі праз год трэба ісці ў школу.

Адзін год — гэта ўсяго адзін пальчык. Калі яго загнуць, год скончыўся.

Віця глядзіць услед дзяўчынкам і то загінае, то выпроствае пальчык. А па вуліцы ідуць і ідуць вучні з партфелямі і вялікімі букетамі ў руках...

---

У каго веды — у таго і сіла.

Навука не мучыць, а жыць вучыць.

## Схаваю цацкі

*Пятрусь Макаль*

Я схаваю цацкі ў шафу —
І мядзведзя,
І жырафу,
І акулу,
І зубра:
— Вам на пенсію пара!
Адпачніце ў цішыні,
Мне цяпер —
Не да гульні!..

Вось ён —
Новы мой набытак:
Карандаш,
Буквар
І сшытак.
Вокладка на буквары,
Быццам дзверы дома.
Ну, а хто тут жыхары?
Літары, вядома.
Стракацяць
За радам рад,
Нібы выйшлі на парад.
Глянеш —
Позірк стоміцца.
Але ўсё ж
Я вельмі рад
З імі пазнаёміцца.

## Двайное свята Ромы Лукашыка

*Мікола Гіль*

З усіх дзён года Рома найбольш любіў дзень нараджэння. Асабліва з таго часу, як паглядзеў па тэлевізары мультфільм пра кракадзіла Гену. Дужа спадабалася хлопчыку песенька пра чараўніка, які прылятае на блакітным верталёце і прывозіць у падарунак ажно пяцьсот порцый марожанага.

Тата кажа, што ў дзень нараджэння чараўнік прылятае абавязкова, толькі ўбачыць яго немагчыма. На тое ён, маўляў, і чараўнік. Вось і знаходзіць Рома пад падушкай ці пад ложкам то машыну новую, то аўтамат, то самаходны, на батарэйках, луназод...

Але Рома любіць свой дзень нараджэння не толькі за падарункі. Куды важней тое, што ў гэты дзень ён падрастае на цэлы год. Было яму, скажам, пяць гадоў, доўга-доўга ўсё пяць ды пяць, а тут прачынаецца — ужо шэсць. Здорава!

Рома вельмі хацеў падрасці хутчэй, каб пайсці ў школу. І вось гэты дзень надышоў. Але Рома спачатку нават быў засмуціўся. Чаму? Ды таму, што нарадзіўся ён першага верасня. А сёлета для яго першага верасня і так свята — у школу

ідзе. Выходзіць, што дня нараджэння як бы і няма, прападае.

Спытаў Рома ў таты:

— А можна перанесці дзень нараджэння на заўтра ці на паслязаўтра?

Тата галавою пакруціў:

— Не, сынок, нельга. На тое ён і дзень нараджэння. Адзін у годзе, сам ведаеш.

— Дык што ж рабіць? — Рома ледзь не плача.

А тата смяецца:

— Анічога! Лічы, што ў цябе сёння не два святы, а адно вялікае. У два разы большае. Двайное свята.

Рома пагадзіўся. Няхай будзе двайное!

Сабраўся і пайшоў з татам у школу. А там — самае сапраўднае свята. Кветкі ўсюды, усе вясёлыя, радасныя.



Настаўніца — зваць яе Марыя Міхайлаўна — паказала кожнаму месца за партай. Рому выпала сядзець з дзяўчынкай Ленай. Нічога, харошая дзяўчынка. Акуратная, з белым банцікам у рыжых косках. Толькі важная вельмі!

Хацеў ён сказаць Лене пра сваё двайное свята, ажно Марыя Міхайлаўна з-за стала паднялася. Усміхнулася так хораша і сказала:

— Ва ўсіх вас, дзеці, сёння вялікае свята. Вы сталі школьнікамі. Вы пачынаеце цікавы і доўгі шлях у навуку. А ў Ромы Лукашыка, акрамя таго, сёння яшчэ і дзень нараджэння. Давайце павіншуем яго.

Усе дружна запляскалі ў далоні.

А Рома сядзеў і шчасліва ўсміхаўся. І здалося яму, што ў класе толькі што пабываў той добры чараўнік з песенькі, які прылятае на блакітным верталёце і прывозіць дзецям радасць...

## Верасень

*Сяргей Панізнік*

Мне Верасень  
Руку падаў:  
— Ты ў школу  
Свой партфель сабраў?  
— Сабраў партфель,  
І сам сабраўся,  
І з вольным летам развітаўся.  
— Куды ж цяпер  
Твой дзень імчыцца?  
— Вучыцца, Верасень,  
Вучыцца.

## Загадка

*У. Мацвеенка*

Кніжкамі набітыя,
На замкі закрытыя
Паселі на плечы
Школьнай малечы.

## Якіх слоў не хапае?

*Міхась Гелер*

* * *

Раніцою ад парога
Кліча кожнага дарога:
Пагранічніка — ў дазор,
Касманаўта — аж да зор,
Маці з бацькам — у калгас,
А мяне — у першы ... .

* * *

Самае чыстае —
Гэта крыніца.
Самае строгае —
Гэта граніца.
Самае смачнае —
Хлеб наш жытнёвы.
Самае моцнае —
Чэснае ... .

## **Першакласнік**

*Марына Барадзіцкая*

Першакласнік выйшаў рана,
Па-святочнаму прыбраны.
На здзіўленне малышоў,
Нават лужу абышоў.
Вымыў вушы ён старанна,
Чырванее грыб на ранцы,
Ды і сам ён, як грыбок,
Пазірае часта ўбок:
Ці ўсе бачаць? Ці ўсе знаюць?
Ці ад зайздрасці ўздыхаюць?

*(Пераклад з рускай)*

## Смяшынка

Малая Маша чытае па літарах: «Шы-чы-у... пы... ак».

— Ну, і што атрымалася? — пытае маці.

— Рыбіна! — адказвае Маша.

## **Загадка**

*М. Пазнякоў*

Днём і ноччу я іду,
Ранкам вас не падвяду.
Нават тых, хто моцна спіць,
Здольны хутка разбудзіць.

## Мой сябар

*Мікола Чарняўскі*

З ім я ў працы,
адпачынку,
На уроку,
перапынку.
З ім я ў полі,
з ім у школе,
З ім не сумна мне ніколі.

З ім вандрую я
па свеце,
З ім лятаю у ракеце.
Чаго сам не адгадаю —
У яго я запытаю.



Ён усё на свеце знае,
Мне ва ўсім ён памагае.
З ім я гутарку вяду
З ім нідзе не прападу.

— Хто ж ён гэтакі,
скажы?
Нам яго ты пакажы.
— Незадачлівы ты,
Мішка...
Сябар мой, вось бачыш,—
кніжка.

## Хітрая літара «Р»

*Уладзімір Ліпскі*

Рос рыс на востраве. А рабінзон Рома марыў вырасціць рэпку. Зрабіў градку пад рабінай, утыркнуў літару «Р», прыгаворваў:

— Расці, «Р»!.. Радуй Рому!

І вырасла на градцы рэкордная рэпка.

Трэба вырваць рэпку. Рабінзон Рома рваў-рваў — не вырваў. Рыссю раз'юшанай рысь прыскакала. Рома за рэпку, рысь за Рому — не вырвалі.

Раптам рабы рабчык прыляцеў. Рома за рэпку, рысь за Рому, рабчык за рысь — не вырвалі.

Прыпоўз берагам разбойнік-рак. Рома за рэпку, рысь за Рому, рабчык за рысь, рак за рабчыка — не вырвалі.

Раздумваюць, разважаюць: як рэпку вырваць?

Вынырнуў з нары крот. Рабінзон Рома просіць:



— Родны крот-працаўнік, выручай! Рэпку не вырвем...

— Зараз падгрызу кор-рань,— прахрыпеў крот і нырнуў у нару.

Рома за рэпку, рысь за Рому, рабчык за рысь, рак за рабчыка, а крот за корань — р-раз! — і вырвалі.

— Ур-р-ра!.. Рэпка наверсе!..

Разам вячэралі. Елі рэпку рабінзон Рома, рысь, рабчык, рак, крот. Радаваліся: дружным гуртам добра рэпку рваць, прыемна разам вячэраць.

## Пераблыталіся словы

*Пятро Сушко*

На траве
Блішчыць каса,
Свішча
Вострая раса.
Баўтануўся ў рэчцы
Шпак,
У садку
Пяе шчупак.
Узляцеў
На пеўня плот,
Збег ад мышкі ў норку
Кот.
Села кветка
На пчалу,

Спілаваў дубок
Пілу...
Пераблыталіся словы.
Хто
Разблытаць іх
Гатовы?

## Смачныя літары

*Еўдакія Лось*

«О» — нібы фасолька,
«Т» — нібы грыбок,
«І» — нібы гарошына,
а пад ёй стручок...
Літары запомню
без лішняй гаманы.
Як жа не запомніць:
смачныя яны!

## Свята настаўніцы

*Васіль Вітка*

Ужо гатовая ісці ў школу, Юля раптам спахапілася:

— Ой, сёння ж свята!

— Якое, Юлечка? — спытала бабка.

— Дзень настаўніка.

Позна было шукаць кветак. І бабка зрэзала астры, якія зацвіталі ў гаршчочках на балконе. Букет атрымаўся бедны і

сіратлівы. Гэта адчувала і ўнучка, несучы яго ў школу.

Вінавата падышла яна да стала настаўніцы і паклала кветкі. Села за парту і ніяк не магла супакоіцца. Вельмі ж яна любіла сваю настаўніцу. Хацелася зрабіць для яе нешта асабліва прыемнае.

Юля адкрыла партфелік. О, якая дарэчная знаходка! У партфеліку ляжаў «Залаты ключык» — адзіная цукерка. Дзяўчынка абрадавалася шчаслівай нечаканасці. Яна дастала цукерку і паклала побач з астрамі.

Настаўніца ўвайшла ў клас. І хаця яшчэ не паспела зірнуць на стол, але так шчыра, так радасна ўсміхнулася,— мабыць, заўважыла Юлін падарунак.

## Буду настаўнікам

*Эдзі Агняцвет*

З беларускай шчырай мовай
Ладзяць нашы галасы.
Эх, пяюцца самі словы:
— Бусел,
верасень,
лясы!

З Вольгай Паўлаўнай цікава.
Не злуецца, не крычыць.

Мы, як быццам для забавы,
Разам вучымся лічыць.

А бяжым на перапынак,
Чуюць хлопчыкі наказ:
— Паважайце вы дзяўчынак —
Будуць паважаць і вас!

Падрасту і ўсё згадаю,
Вашых слоў мне не забыць:
— Дзеці,
кожнаму жадаю
Чалавекам добрым быць!

У няшчасці друг далёкі,
Трапіў у бяду сусед,—
Не глядзі спакойна збоку,
Памажы яму як след!

Адкрывае школа цуды
Мне і ўсім маім сябрам.
Калі-небудзь, можа, буду
Я настаўнікам і сам.

## Урок малявання

*Таццяна Гарэлікава*

— Зараз у нас, дзеці, урок малявання,— сказала настаўніца.— У кожнага з вас на парце каляровыя алоўкі і чысты сшытак. Намалюйце тое, што ўмееце.

Віця не надта любіў гэтую справу. От, каб настаўніца сказала развінціць ці сабраць машыну... А маляваць яму нецікава.

Алоўкі былі новыя, бліскучыя, добра завостраныя. Віця ўзяў чырвоны, ён любіў чырвоны колер. Але што ж намаляваць?

Віця зазірнуў у сшытак суседа. Там красаваўся танк. Танк быў вялікі, зялёны, а на баку ў яго палымнела чырвоная зорка.

Пра танкі Віцю шмат расказваў дзядуля — на вайне ён быў танкістам. А яшчэ бачыў іх Віця па тэлевізары. Толькі тыя танкі былі чорныя. Грукат, дым, полымя — і чорныя танкі...

Хлопчык перагарнуў старонку, узяў чорны аловак і пачаў вадзіць па белай паперы.

Настаўніца падыходзіла да вучняў, брала іхнія малюнкі і паказвала класу. На адных былі кветкі і матылькі, на другіх — шматпавярховыя дамы з сонцам у вокнах, машыны ці высокія, аж пад неба, краны...

— А ў цябе, Віця, што намалявана? — здзівілася настаўніца, глянуўшы ў яго сшытак.— І навошта столькі чарнаты?

Хлопчык збянтэжыўся і маўчаў.

— Ну? Чаму ж ты маўчыш?

— Гэта вайна,— ціха адказаў Віця.— Я ўчора па тэлевізары бачыў.

Настаўніца ўсё зразумела і ласкава пагладзіла яго па галаве. Якраз як мама.

А за акном прыветна свяціла сонейка, чырванела гронкамі рабіна, а на ёй усё скакалі неўгамонныя вераб'і.

Чалавек без радзімы, што салавей без песні.

### Задачка

*Мікола Чарняўскі*

Курка на рынак схадзіла,
Жменьку зярнятак купіла.

Жменьку зярнятак купіла,
Дзеткам усё падзяліла.

Дзевяці кураняткам
Дасталося па зярнятку.

Адно ад чародкі адбілася
І на дзяльбу спазнілася.

Колькі было зярнятак?
Колькі было куранятак?

## Сяргей

*Міхась Пазнякоў*

Клічуць хлопчыкі:
— Сяргей!
Ты гуляць выходзь
Хутчэй!
Кніжку
Потым дачытаеш
І задачку дарашаеш.
— Не, сябры,
І вам не раю.
Перш я кніжку дачытаю,
А затым
Рашу задачу.
А пасля галоўных спраў
Час настане для забаў.

## Нясконччаная казка

*Галіна Каржанеўская*

На дом настаўніца задала казку. І не тое каб прачытаць ці перапісаць — прыдумаць самім.

Казка складвалася цяжка і марудна. Бывала, што і за сталом Паўлік заміраў з неданесенай да рота лыжкай. Тады маці казала:

— Паўлік, вярніся на зямлю! І пра што ты ўвесь час думаеш?

Старэйшы брат Косця хмыкаў і ўстаўляў сваё важкае слова:

— Ён у нас, як маленькі дзядок.

Косця ўжо ў дзевятым і часам любіць з брата пакпіць.

Будучая казка спела ў душы, варушылася і не давала спакою. Паўлік, нават мяч ганяючы, памятаў пра яе. Пачатак склаўся сам, і лепшага быць не магло.

«Жыў-быў хлопчык...»

Далей заставалася спісваць з сябе.

«Любіў ён кіно глядзець, у футбол гуляць і лавіць рыбу. Як толькі прыйдзе лета, бярэ ён вуду, вядзерца і хутчэй на рэчку. Ідзе раз з рыбалкі і чуе: плача нехта ў жыце. Расхінуў каласкі, а там...»

Тут выйшла замінка. Таго, хто сустрэўся хлопчыку ў жыце, бабуля называла «бацян», а ў чытанцы напісана — «бусел». Бусел лепш, вырашыў Паўлік і для сябе зазначыў, што бусел малы. Інакш бы не плакаў.

«...Адхінуў каласкі, а там буслік. Убачыў хлопчыка і спалохаўся.

— Не бойся, буслік,— супакоіў яго хлопчык.

— Я і не баюся,— адказаў буслік і выцер слёзы.

— Цябе пакрыўдзілі? — пытаецца хлопчык.

— Ніхто мяне не крыўдзіў,— сказаў буслік.

— А чаго ты плачаш?

— Есці хачу».

Косця звесіў над братам свае пярэстыя віхры і вышукваў у напісаным недахоп:

— Падбірай словы. А то — «сказаў» ды «сказаў»... Думаць трэба.

Паўлік закрыў далоняй радкі, і Косця, хмыкнуўшы, адышоўся.

«— Ты галодны? — здзівіўся хлопчык.— Хіба ты не ясі зярнят?

— Я не курыца,— прамовіў буслік.— Мая ежа — жабоцькі і рыба.

Хлопчык глянуў на сваё вядзерца, дзе плавала адна-адзіная плотачка.

— Што ж, вазьмі маю рыбку.

Буслік злазіў дзюбай у вядзерца і прыкметна павесялеў. Потым паскардзіўся:

— Зусім тут жабак не стала. Тата расказваў, што раней на месцы гэтага поля было вялікае балота. Усім

нам ежы хапала — і дарослым, і малым.

— Але ж і поле патрэбна,— не пагадзіўся хлопчык.— Бачыш, жыта вырасла, людзям хлеб будзе. Хлеб важней, чым жабкі.

— Не, жабкі важней!

— Хлеб!

— Жабкі!..»

Хлопчык задумаўся. Нецікавая атрымлівалася казка: ні цудаў, ні здарэнняў у ёй. А галоўнае — ён сам заблытаўся з гэтай спрэчкай. Выходзіла, што ў хлопчыка свая праўда, а ў бусліка — свая. Канец не атрымліваўся. Што ж, Паўлік здасць казку такой, якой яна напісалася. Хай сабе і без канца.

Позна вечарам, уклаўшыся спаць, Паўлік зразумеў, чаго не хапала казцы. Павінен з'явіцца нехта трэці і памірыць бусліка з хлопчыкам. Але хто?

Ужо тады, калі млявасць агарнула цела, уявіўся Паўліку дзядок-лесавік. Маленькі такі, смешны, з шапачкай набакір. Пачуў ён гучныя галасы — і тут як тут. Што сказаў дзядок бусліку і хлопчыку — Паўлік не ведае. Ён ужо соладка спаў.

## Цікаўныя сарокі

*Анатоль Зэкаў*

Ляцелі ў школу на урокі
Белалобыя сарокі.
Бачаць:
Проста з возера
П'юць ваду
бульдозеры.
Заглядзеліся сарокі —
І спазніліся на ўрокі.

## Чытачы

*Яўген Крупенька*

Злезла з печы
Мурка-кошка,
Пахадзіла
Каля ложка,
Прыкмеціла
Кніжку,
Паклікала
Мышку:
— Досыць,
Мышка,
Гуляць,
Будзем
Кніжку
Чытаць.



## Саўка ды Грышка

*Алесь Пісьмянкоў*

Саўка ды Грышка
Лёталі з гары.
Пагублялі кніжкі,
Кніжкі-буквары.
А сабака Рыжык
Згледзеў буквары:
«Зацягну у будку
Ды чытаць там буду!»

Не кідаць жа кніжку
Так, як Саўка з Грышкам,
Бо й суседскі Шарык
Марыць пра букварык.

## Не адна я маленькая...

*Павел Кавалёў*

Родзічы Ніначкі гаварылі: «Наша Ніначка марудна расце, бо мала есць». А тая ела, як і ўсе дзеці, столькі, колькі хацелася. І ўсё ж прыліпла да Ніначкі — маленькая ды маленькая. Ажно да той пары, пакуль Ніначка ў школу не пайшла.

Сярод сяброўак і сяброў-першакласнікаў Ніначка ўпершыню адчула сябе маленькай. Ажно крыўда ахапіла яе. Як ні зірне вакол сябе ў гурце школьнікаў —

яна самая малая. Мо сапраўды мала ела?

Але ні настаўніца, ні вучні — ніхто маленькай Ніначку не называў. А толькі па імені — Ніна — ці поўнасцю — Ніна Купрэйчык.

Тым часам у класе з'явіўся новы вучань — Васілёк. Бацькі яго пераехалі з далёкага горада.

Васілька настаўніца пасадзіла на парту недалёка ад Ніначкі. Глядзіць тая на яго і дзівіцца, які ён маленькі. Можа, нават меншы ростам за яе ўдаўся. А як аднойчы на перапынку сталі адзін каля аднаго, Ніначка зусім павесялела: «Не, не адна я маленькая...»

## Экзамен

*Авяр'ян Дзяржынскі*

Першакласніку Міколу,
Толькі той
Прыйшоў са школы,
Мама, госці маміны
Ладзілі экзамены:
— Дзве цукеркі на, Міколка,
Дзве яшчэ
І яшчэ столькі.
Колькі ўсіх? —
Пытаюцца.
— Аніводнай, з'ем усе,
Вельмі падабаюцца!

* * *

Бацька пытае ў свайго сына-першакласніка:

— Ну, падабаецца табе хадзіць у школу?

— Хадзіць падабаецца. Сядзець не падабаецца.

* * *

— Тата, ведаеш, колькі зубной пасты ў тваім цюбіку?

— Не ведаю.

— Два метры і чатыры сантыметры. Я толькі што змераў.

* * *

— Не разумею,— кажа настаўніца,— як адзін чалавек мог нарабіць столькі памылак?!

— Я не адзін. Гэта мы ўдвух з дзедам.

## Прыйдзе белая зіма

*Маша Галямава*

Дні становяцца карацейшымі і карацейшымі. Барыс разам з матуляй насушылі вялікую торбу грыбоў і падвесілі іх у каморы на шнурках. На палічках чырва-



нее малінавае і брусьнічнае варэнне. На ніжняй палічцы — торбачка з птушыным кормам.

Барыс — першакласнік.

Кожную раніцу, перш чым закінуць за плечы вучнёўскі ранец, ён насыпае жоўтых семак на дошчачку пад акном, каб іх хапіла сінічкам, пакуль ён вернецца са школы.

З гнязда вылятаюць чатыры птушаняткі. Адно з іх мае светла-блакітны чубок, як і маці-сініца. Яно самае смелае.

Лятае далей за іншых, а пад вечар апошнім вяртаецца дамоў.

Кот перастаў цікаваць пад ялінай, і Барыс можа спакойна сядзець за школьнай партай. Ён ведае, што мама-сініца выгадавала птушанят, што яны самі могуць паклапаціцца пра сябе.

І калі неўзабаве прыйдзе белая зіма з марозам і мяцеліцамі, хлопчык разам з бацькам павесяць на высокай яліне скрылікі сала.

Гэта будзе як навагодняя ёлка, якая ніколі не асыплецца.

*(Пераклад са славацкай)*

## Школьны ранец

*Іван Бурсаў*

У Міколкі-Мікалая
Ранец,
Што кладоўка тая.
І чаго няма ў ім
Толькі!
Апельсінавыя долькі,
Шайба,
Сыр для кошкі,
Клюшка,
Ад вядра старога
Дужка.
Шустры хрушч
У карабку
І прапелер на цвіку.
Ад люстэрка два асколкі,
Дзве «Мурзілкі»,
Тры «Вясёлкі».
Гумка-жвачка,
Шпулька нітак,

Ёсць аловак, дзённік,
Сшытак.
Усяго-ўсяго ў дастатку!
Аднаго няма —
Парадку.

*(Пераклад з рускай)*

## Літары больш не падаюць

*Маргарыта Яфімава*

Да Каці ў госці прыехала бабуля. Усе былі вельмі рады, а Кацярынка дык ад яе не адыходзіла. Шчабятала і шчабятала, зазіраючы ў добрыя прамяністыя вочы сваёй бабулі. Гаварыла пра тое, як у іх першым класе прыгожа і ўтульна, як цікава вучыцца, колькі ў яе сяброваk...

Раптам дзяўчынка засмуцілася і ціха, каб чула толькі бабуля, сказала:

— А ў мяне бяда.

— Якая, унучачка, бяда? — занепакоілася бабуля.

— Ведаеш, у мяне літары падаюць.

— Як гэта падаюць?

— А вось так: я іх выводжу, стараюся, а яны падаюць то ў адзін, то ў другі бок.

— Нічога, Кацярынка,— супакойвае бабуля.— Гэта ж і дзіця не адразу хадзіць навучыцца.

— То ж дзіця, а гэта літары. Яны нежывыя.

— Так-так,— усміхнулася бабуля,— нежывыя. Але паглядзі, Кацярынка: калі напішаш прыгожа літару, дык яна нібыта радуецца і ўдзячна ўсміхаецца табе.

Села за стол Кацярынка, піша і ўважліва да кожнай літары прыглядаецца. Ой! Сапраўды прыгожая літара, нібы ўсміхаецца ёй. А бабуля падбадзёрвае:

— Старайся, унучачка, старайся! Усё ў цябе атрымаецца.

І так цікава стала дзяўчынцы пісаць! А праз колькі дзён, вярнуўшыся са школы, ад самых дзвярэй Кацярынка радасна закрычала:

— Бабуля! Літары больш не падаюць! Не падаюць!

— Вось і добра,— адказала тая і лагодна прытуліла ўнучку да сябе.

## Забаўлянкі-пазнаванкі

*Уладзімір Паўлаў*

1. Кажа нянька:
   — Спі, дзіцятка,
   Хутка зварыцца
   Аладка.
     — Нянька кажа няправільна.
     — Чаму?

2. У гародзе жыў бурак,
Лез пішчом на плот, дзівак.
Ну, а брат яго гарбуз
Аж па храпку ў дол загруз.
Адбылася блытаніна.
— Якая?

3. — Тату з мамаю скажыце:
Жаб пайшоў лавіць я ў жыце.
Буслік торбу з крука зняў...
Можа, ён чаго не знаў?
— Так, не знаў.
— Чаго?

4. У паношаны камзол
Сунуў хлеба лусту
І пайшоў стары казёл
Вартаваць капусту.
— Не пускайце, спыніце казла!
— Чаму?

## Мы ўсё можам

*Еўдакія Лось*

Гэта праўда, што на свеце
ёсць яшчэ такія дзеці,
што не ўмеюць
маляваць,
шыць, ляпіць і пілаваць,
лялькам хаткі будаваць?

А ці праўда, што на свеце
ёсць яшчэ такія дзеці,
што лянуюцца спяваць,
ў ладкі пляскаць, танцаваць?

Мы што хочаце змайструем,
і спяём, і патанцуем.
Хата родная падчас
ходзіць ходырам ад нас!

## Развітаемся, званок!

*Мар'ян Дукса*

Сёння ў нас апошні ўрок —
ты звіні даўжэй, званок,
доўга, радасна звіні
жаўранкам увышыні.
Зычна, весела, заўзята
абвясці пра наша свята.
Колькі раз ты
гучна-гучна
на урокі клікаў вучняў —
далятаў і да сталоўкі,
і да шумнай спортпляцоўкі...
Сёння ў нас апошні ўрок —
развітаемся, званок!
Падары растанне гэта,
звонка выпусціўшы ў лета.
Сам жа, сцішаны, у зморы
спі спакойна ў калідоры.

## Гэты цуд завецца — кніга!

### Сцэнарый ранішніка

*Маргарыта Яфімава*

У ранішніку ўдзельнічаюць, апрача вучняў, вядучы(-ая) і дзед Усёвед. Афармленне святочнае, з выкарыстаннем нацыянальнай сімволікі, арнаменту, кветак, галінак. У цэнтры — партрэт беларускага першадрукара Францішка Скарыны.

Вядучы. Сёння наш ранішнік, дзеці, прысвечаны кнізе. Але перш чым мы яго пачнём...

Вядучы спыняецца, бо ўваходзіць хтось з дарослых ці дзяцей і перадае яму тэлеграму.

Вядучы. А гэта што? Няйначай, тэлеграма. (Чытае.) «Будзем на свяце. Чакайце. Сябры». Пачакаем?

Дзеці. Пачакаем!

Вядучы (глядзіць у тэлеграму). Сябры... Хто ж гэта, дзеці, спяшаецца да нас? Цішэй. Здаецца, нехта ўжо набліжаецца да дзвярэй нашай залы. Давайце дружна скажам: «Ча-ка-ем!» (Дзеці дружна паўтараюць.) Яшчэ дружней і весялей: «Ча-ка-ем!»

Пад марш ці бадзёрую песню выходзяць «кнігі», 5—10. Гэта дзеці, якія трымаюць перад сабой спецыяльна намаляваныя, прыгожыя во-

кладкі кніг, на якіх — прозвішча аўтара і назва кнігі. Гэта, напрыклад, «Буквар», «Казкі», «Дударык» Васіля Віткі, «Загадкі» Ніла Гілевіча, «Лемантар» Максіма Танка, «Ці пазяхае бегемот?» Рыгора Барадуліна, «Хата, поўная гасцей» Васіля Зуёнка, «Як Тоня рэха шукала» Алега Лойкі, а таксама новыя кнігі Эдзі Агняцвет, Артура Вольскага, Міколы Чарняўскага, Ніны Галіноўскай і інш. (па выбару настаўніка). Зусім не абавязкова дакладна капіраваць афармленне вокладкі, галоўнае — каб назвы былі буйнымі і ўсім бачнымі.

Вядучы. Дзеці, вы, безумоўна, здагадаліся, хто прыйшоў да нас у госці. Гэта (усе разам) — кнігі.

Вядучы. Так, кнігі. Кожная з іх — непаўторны дзівосны свет. Ды лепей, каб самі кнігі расказалі пра сябе. Папросім іх.

Дзеці. Просім! Просім!

Кожная «кніга» выходзіць наперад і гаворыць сваё слова.

«Казкі»:

Тут цябе чакаюць казкі.
Слухай толькі, калі ласка.

«Як Тоня рэха шукала»:

Пакаштуеш маліны і смачных арэхаў,
Як пойдзеш адшукваць няўлоўнае рэха.

«Ці пазяхае бегемот?»:

Раскрыеш ад здзіўлення рот,

Як пазяхне ўсмак бегемот...

«Хата, поўная гасцей»:

Завітай сюды хутчэй —
У хату, поўную гасцей.

«Дударык»:

Сеў у полі на каменьчыку,
Узяў дудку на раменьчыку.
Ду-ду-ду — дуда гудзе,
Полем водгалас ідзе.

(З іншых кніг можна чытаць па страфе ці кароткім вершы.)

Вядучы. Вось колькі дзівосаў абяцаюць нам кніжкі! Усіх кніг не назавеш, пра ўсё не раскажаш... А якая з гэтых вам больш падабаецца, дзеці? (Дзеці адказваюць.) Добра. Адчуваю, што вы любіце кніжкі. Ці ж можна іх не любіць? А вось за што мы іх любім — пра гэта раскажа нам верш Эдзі Агняцвет «З табою, кніга добрая».

«Кнігі» садзяцца на крэселкі па баках сцэны (ці залы), наперад выходзяць чытальнікі.

1-ы чытальнік. Я добрую кнігу,
Як цуда, люблю.
Яна асвятляе
Людзей і зямлю.

2-і чытальнік. На кожнай старонцы
Адкрыю сакрэт.

Там ветразь пад
сонцам,
Таемны сусвет.

3-і чытальнік. З табою, кніга
добрая,
Ідзём у новы век.
Ты мудрая і
шчодрая,
Як добры чалавек!

4-ы чытальнік. З табой пачынае
Дарогу герой,
Ён прагна чытае,
Сябруе з табой.

5-ы чытальнік. Душою прыгожы
Расце будаўнік —
І жыць ён не можа
Без песень і кніг.

1-ы чытальнік. Я добрую кнігу,
Як цуда, люблю.
Яна асвятляе
Людзей і зямлю.

Чытальнікі ідуць на месцы, адзін з іх натыкаецца на скрутак паперы: «Ой, што гэта?»

Вядучы (бярэ скрутак у рукі). Дзеці! Хто з вас ведае, што гэта? (Дзеці адказваюць, як могуць.) Давайце спытаемся ў кніжак. Мне здаецца, што невыпадкова гэты скрутак трапіў на наш ранішнік.

«Кнігі» падыходзяць, разглядаюць з розных бакоў скрутак. Потым адказваюць: «Не, не ведаем...»

Кніга «Хата, поўная гасцей». Чакайце! Чакайце! У маёй хаце, поўнай гасцей, быў адзін цікавы чалавек — дзед Усёвед. Пэўна, ён растлумачыць, што гэта такое.

Вядучы і «кнігі». «Дык клічце яго хутчэй!»

Кніга «Хата, поўная гасцей». Дзед Усёвед сам прыйдзе, як толькі пачуе песні, скокі. Ён гэта вельмі любіць.

Вядучы. Дык станавіцеся, дзеці, у круг!

Дзеці водзяць карагод разам з «кнігамі». Уваходзіць, стукаючы кіем і прытоптваючы, стары прыгорблены дзед Усёвед. Гэта казачная істота, нечым падобная да Лесавіка. З-пад саламянага брыля тырчаць сівыя валасы, да адзення прымацаваны лісты, кветкі, на спіне — торба.

Патанцаваўшы крыху з дзецьмі, дзед Усёвед гулка стукае кіем аб падлогу. Музыка сціхае.

Дзед Усёвед. Весела ў вас. Не стрымаўся я, бачыце, прыйшоў на ваша свята. А цяпер кажыце, чаго звалі, чаму спаць не давалі?

Хлопчык. Хочам у вас пра нешта спытацца.

Дзяўчынка. Вы ж усё-ўсё ведаеце, таму і завяцеся дзед Усёвед.

Дзед Усёвед. Так, так, дзеткі мае, доўга жыву, шмат ведаю, амаль пра ўсё сказаць магу.

Вядучы. Дык скажыце, дзядуля, што гэта за скрутак?

Дзед Усёвед (бярэ скрутак, разгортвае). Дык гэта ж, дзеці, кніга.

Нехта з дзяцей. Дзядуля, якая ж гэта кніга? Вось кніга! (Падае яму кнігу.)

Дзед Усёвед (бярэ яе ў рукі). Ведаю, ведаю... Прыгожая, зручная кніга, лісточак з лісточкам склееены, друкаваныя літары роўненька леглі, нібы пасеяны. Вачэй не адарваць. Але ж даўней, дзеткі, зусім не такой была кніга. Вось так яна спачатку выглядала (паказвае скрутак). Ведайце, што першыя кнігі перапісваліся ад рукі. Гэта была марудная, цяжкая і карпатлівая справа. Кніжак было мала, і каштавалі яны вельмі дорага.

Вядучы. Дзядуля Усёвед, затое цяпер у нас кнігі ў кожнай кватэры, у кожнай школе, у бібліятэках...

Дзед Усёвед. Гэта было б немагчымым, калі б не наш славуты зямляк — першадрукар Францішак Скарына.

Вядучы. Ці чулі вы такое імя —

Францішак Скарына? (Дзеці адказваюць — «так», «не»...)

Дзед Усёвед. Паглядзіце на партрэт Францішка Скарыны. Запомніце гэта імя.

Вядучы. Давайце паўторым разам — Францішак Скарына.

Дзед Усёвед. Гэта быў вельмі адукаваны чалавек. Нарадзіўся ён у старажытным Полацку. Бацька хацеў, каб ён стаў купцом, але ён стаў славутым на ўвесь свет вучоным.

Вядучы. Шмат краін пабачыў наш славуты зямляк, але ніколі не забываўся пра сваю Радзіму, пра свой народ.

Дзед Усёвед. І кнігі свае Францішак Скарына друкаваў на зразумелай простым людзям тагачаснай беларускай мове.

Вядучы. А ці ведаеце вы, дзеці, як называецца магазін, у якім прадаюцца кнігі?

Дзеці адказваюць, дзед Усёвед абагульняе: так, кнігарня.

Вядучы. А цяпер паслухаем верш «У кнігарні». Напісаў яго паэт Кастусь Цвірка.

1-ы хлопчык.

Мы прыйшлі ў кнігарню з мамай,
На паліцах — безліч кніг!

Тоўстых, тонкіх — розных самых,
Цэлы свет — у кніжках тых!

Маці.

— Я куплю табе во гэту...
Гэту й гэту варта ўзяць...
Ты пра ўсе краіны свету
З гэтых кніжак будзеш знаць.
Пра Аўстралію, Аляску,
Чылі, Індыю, Кітай,
Пра Еўфрат во нават казка...
Толькі, сын, бяры чытай.

1-ы хлопчык.

— О, як добра! Дзякуй, мама!
Я пра іх чытаць люблю.
Толькі б знаць хацеў таксама
Я й пра нашую зямлю.

2-і хлопчык.

Пра яе лясы і рэкі,
Пра забытыя гады,
Пра той шлях з вараг у грэкі
І пра казкі-гарады.
І яшчэ — за што, няйначай,
Буду ўдзячны я ўдвайне —
Ты купі на мове нашай,
Беларускай, кніжку мне.

3-і хлопчык.

То ж Айчыны нашай мова,
Мова прадзедаў, бацькоў.
У той мове што ні слова —
Дыямент жывы вякоў.

4-ы хлопчык.

Ці паляк, ці грэк, ці швед там —
Мова ў кожнага свая.
Як усе, хацеў бы ведаць
Мову родную і я.

1-ы хлопчык.

Невук — хто яе не цэніць.
Ці ж магу я здраджваць ёй:
Я ж не нейкі адшчапенец,
Я ж не нейкі чужаземец
На святой зямлі сваёй.

Дзед Усёвед. Добра, добра, дзеткі, што вы любіце мову і кніжкі беларускія, што родная мова вам дарагая. Можа, і песню беларускую мне праспяваеце? (Дзеці спяваюць.) Добра, весела ў вас, але і развітвацца пара. На развітанне загадку вам загадаю: хто са мною пасябруе, таму веды падару я. Што гэта?

Дзеці. Кніга!

Дзед Усёвед. Малайцы! Ну, да пабачэння, спяшацца мне трэба.

Вядучы. Развітаемся з дзедам Усёведам. Скажам яму: «Да пабачэння!» Вось і скончылася наша свята, прысвечанае беларускай кнізе.

## ЗМЕСТ

### Калі я шчаслівы

Калі я шчаслівы. *Ніна Галіноўская* . . . . . . 4
Свята. *Юрась Свірка* . . . . . . . . . . 5
Стасікава кладка. *Міхась Даніленка* . . . . . 6
Дарагая мамачка. *Леанід Пранчак* . . . . . . 8
Насаджу садок. *Іван Грамовіч. Скарочана* . . . —
З мамай. *Ніна Галіноўская* . . . . . . . . . 9
Якіх слоў не хапае? *Міхась Гелер* . . . . . . 10
Будзьце госцем. *Леанід Шырын* . . . . . . . 11
Дзень нараджэння. *Ганна Іванова* . . . . . . 12
Замаўлянка. *Мікола Чарняўскі* . . . . . . . 13
Лічылка. *Уладзімір Мацвеенка* . . . . . . . 14
Разумны аловак. *Даір Слаўковіч* . . . . . . —
Змей лятаў. *Мікола Чарняўскі* . . . . . . . 15
Татава аўтаручка. *Мікола Гіль* . . . . . . . 16
Міколка і Маша. *Галіна Каржанеўская* . . . . 18
Чаго крычыце? *Іван Грамовіч* . . . . . . . . —
Скорагаворка. *Мікола Маляўка* . . . . . . . 19
Сястрычка вышывала. *Іван Муравейка* . . . . —
Самакат. *Мікола Мятліцкі* . . . . . . . . . 20
Піла. *Павел Марціновіч* . . . . . . . . . . —
«Давай яшчэ разік...» *Уладзімір Ліпскі* . . . . 21
Наша сям'я. *Міхась Пазнякоў* . . . . . . . . 22
Тата з мамай у кіно. *Віктар Шніп* . . . . . . 23
Каго больш? *Рыгор Барадулін* . . . . . . . . 24
Нашы продкі. *Сяргей Тарасаў* . . . . . . . . —
Дзве каскі. *Васіль Хомчанка. Скарочана* . . . 25
Дзядуля. *Леанід Пранчак* . . . . . . . . . 27
Дыялогі з унучкамі. *Васіль Вітка* . . . . . . —
Скорагаворкі. *Уладзімір Скарынкін* . . . . . 28
Абібок. *Мікола Хамянкоў* . . . . . . . . . 29
Унукі. *Ларыса Геніюш* . . . . . . . . . . . —
Як працуе сэрца. *Таццяна Мушынская* . . . . 30
Ой, як смешна. *Ніл Гілевіч* . . . . . . . . 31
Малюта, Бора і Дзюдзя. *Алена Лось* . . . . . 32
Далей ад бяды. *Леанід Шырын* . . . . . . . 33
Зубры. *Антаніна Баева* . . . . . . . . . . 34

Загадка. *У. Мазго* . . . . . . . . . . . . . . 35
Маці. *Рыгор Ігнаценка* . . . . . . . . . . 36
Самая прыгожая. *Васіль Сухамлінскі* . . . . 37
Скорагаворка. *Васіль Вітка* . . . . . . . . . 38
Салодкія сны. *Леанід Шырын* . . . . . . . . —
Мама. *Васіль Хомчанка* . . . . . . . . . . 39
Радасць. *Уладзімір Карызна* . . . . . . . . 41

**Вечарамі казкі баю**

Песенька Дзеда-барадзеда . . . . . . . . . . 43
Калыханкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
А каты мае, каты... . . . . . . . . . . . —
А ты, коця, не вурчы... . . . . . . . . . . —
Ой, люлí-люлí... . . . . . . . . . . . . . 45
Спі, Ванюшачка, не плач... . . . . . . . . —
Пайшоў каток на таржок... . . . . . . . . —
Пайшоў каток пад масток... . . . . . . . . —
Калыскі . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Загадка. *У. Мацвеенка* . . . . . . . . . . 47
Песні, заклічкі, прыгаворкі . . . . . . . . —
Зайчык маленькі . . . . . . . . . . . . . —
Я гарох малачу . . . . . . . . . . . . . . 48
Забаўлянкі . . . . . . . . . . . . . . . . 50
Лады, лады, ладкі . . . . . . . . . . . . —
Ідзе каза рагатая . . . . . . . . . . . . —
Ідзе Бай па сцяне . . . . . . . . . . . . 51
Кую, кую ножку . . . . . . . . . . . . . —
Чыкі-чыкі, сарока . . . . . . . . . . . . 52
Чук-чук-чук... . . . . . . . . . . . . . —
Тра-та-та, тра-та-та... . . . . . . . . . . —
Ладу-ладу-ладкі... . . . . . . . . . . . . —
Лічылкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Раз, два, тры, чатыры... . . . . . . . . . —
Раз, два, тры, чатыры, пяць... . . . . . . —
Беглі коні пад мастамі... . . . . . . . . . —
Эны-бэны, фіны, лёк... . . . . . . . . . . 54
Загадкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Па народных матывах . . . . . . . . . . . . 55
Калыханка-хваляванка. *Павел Марціновіч* —
Дажджавая калыханка. *Васіль Жуковіч* . . 56

Ай і ой. *Васіль Вітка* . . . . . . . . . 56
Ножкі. *Нэля Тулупава* . . . . . . . 57
Коцік плача. *Ганна Іванова* . . . . . . . —
Ехаў Бай. *Максім Танк* . . . . . . . 58
Казкі . . . . . . . . . . . . . . 59
Як певень з бараном ваўку стра́ху нагналі —
Муха-пяюха. *(Казка для тэатра.) М. Яфімава* 62
Верныя сябры. *Васіль Гурскі* . . . . . 64
Вясёлы ветрык. *Сяргей Тарасаў* . . . . 66
Лясное дзіва. *Мікола Чарняўскі* . . . . 69
Як рабілі вясёлку. *Яраслаў Пархута* . . . 73
Неслух. *Аляксей Якімовіч* . . . . . . 75
Казка пра зайца. *Таццяна Красікава* . . . 77
Бульбінка і вінаград. *Ларыса Шыпуля* . . 79
Чароўны прасік. *Уладзімір Ліпскі* . . . . 80

**Слухай родную прыроду**

Слухай родную прыроду. *Васіль Жуковіч* . . . . 84
Як вясна зіму прагнала. *Алесь Асіпенка* . . . 85
Вясна ідзе. *Валерый Кастручын* . . . . . . 86
Ажылі пралескі. *Паўлюк Прануза* . . . . . 88
Загадка. *М. Пазнякоў* . . . . . . . . . —
Свята мурашак. *Кастусь Кірэенка* . . . . . 89
Жаўрук. *Леў Мароз* . . . . . . . . . . 90
Скорагаворка. *Ніна Галіноўская* . . . . . . —
Жавароначкі, прыляціце... *Уладзімір Ягоўдзік* 91
Паілачка. *Валерый Кастручын* . . . . . . . 92
Казка пра канарэйку. *Алена Кобец-Філімонава* 93
Бусел і хлопчык. *Авяр’ян Дзеружынскі* . . . —
Блакітны буданчык. *Фама Рамашка* . . . . . 94
Петрусёў гадаванец. *Ядвіга Бяганская* . . . 95
Фіялка. *Клаўдзія Каліна* . . . . . . . . 96
Адуванчык. *Авяр’ян Дзеружынскі* . . . . . 98
Загадка. *В. Жуковіч* . . . . . . . . . . —
Шпачынае гняздо. *Міхась Пазнякоў* . . . . 99
Камень. *Васіль Сухамлінскі* . . . . . . . 100
Мая песня. *Ніна Галіноўская* . . . . . . . 102
Частуйся, дзяцел! *Фама Рамашка* . . . . . —
Пра Толіка і пра жабу. *Пятро Васючэнка* . . 103
Не будзіце салавейку! *Алесь Бадак* . . . . . 106

Кветкі плачуць . . . . . . . . . . . . . . . 107
Не ўкусіла. *Павел Кавалёў* . . . . . . . . . 108
Загадкі. *Ніл Гілевіч* . . . . . . . . . . . —
Дуб-заступнік. *Максім Валошка* . . . . . . 109
Ручаёк. *Васіль Зуёнак* . . . . . . . . . . 111
Скорагаворка. *Васіль Жуковіч* . . . . . . . 112
Прыз за цікаўнасць. *Валерый Кастручын* . . . . —
Загадка. *Д. Бічэль-Загнетава* . . . . . . . 113
Чарнічка. *Артур Вольскі* . . . . . . . . . 114
Мікіткаў сон. *Лідзія Арабей* . . . . . . . . 115
Павуцінка. *Ніна Галіноўская* . . . . . . . . 118
Загадка. *У. Мацвеенка* . . . . . . . . . . —
Лета ў серванце. *Мікола Янчанка* . . . . . . —
Загадка. *В. Карпечанка* . . . . . . . . . . 123
Лета надламалася. *Рыгор Ігнаценка* . . . . . —
Верабейкі загартоўваюцца. *Мікола Янчанка* . . 124
Дзічка. *Рыгор Ігнаценка* . . . . . . . . . 125
Жолуд. *Леанід Шырын* . . . . . . . . . . . 126
Зімовы дуб. *Клаўдзія Каліна* . . . . . . . . —
Захапленне. *Павел Кавалёў* . . . . . . . . 128
Сярожкавы сябры. *Пятро Сушко* . . . . . . . 129
Лясная госця. *Расціслаў Бензярук* . . . . . —
Бывай, зіма! *Мікола Бусько* . . . . . . . . 131

**Пра ўсё раскажа школа**

Хутчэй бы ў школу. *Міхась Валько* . . . . . . 133
Адзін пальчык. *Клаўдзія Каліна* . . . . . . —
Схаваю цацкі. *Пятрусь Макаль* . . . . . . . 135
Двайное свята Ромы Лукашыка. *Мікола Гіль* 136
Верасень. *Сяргей Панізнік* . . . . . . . . 138
Загадка. *У. Мацвеенка* . . . . . . . . . . 139
Якіх слоў не хапае? *Міхась Гелер* . . . . . —
Першакласнік. *Марына Барадзіцкая* . . . . . 140
Загадка. *М. Пазнякоў* . . . . . . . . . . —
Мой сябар. *Мікола Чарняўскі* . . . . . . . . 141
Хітрая літара «Р». *Уладзімір Ліпскі* . . . . . 142
Перабблыталіся словы. *Пятро Сушко* . . . . . 143
Смачныя літары. *Еўдакія Лось* . . . . . . . 144
Свята настаўніцы. *Васіль Вітка* . . . . . . —
Буду настаўнікам. *Эдзі Агняцвет* . . . . . . 145

Урок малявання. *Тацціяна Гарэлікава* . . . . 146
Задачка. *Мікола Чарняўскі* . . . . . . . . 148
Сяргей. *Міхась Пазнякоў* . . . . . . . . . 149
Няскончаная казка. *Галіна Каржанеўская* . . —
Цікаўныя сарокі. *Анатоль Зэкаў* . . . . . . 153
Чытачы. *Яўген Крупенька* . . . . . . . . —
Саўка ды Грышка. *Алесь Пісьмянкоў* . . . 154
Не адна я маленькая... *Павел Кавалёў* . . . —
Экзамен. *Авяр'ян Дзеружынскі* . . . . . . 155
Прыйдзе белая зіма. *Маша Галямава* . . . . 156
Школьны ранец. *Іван Бурсаў* . . . . . . . 158
Літары больш не падаюць. *Маргарыта Яфімава* 159
Забаўлянкі-пазнаванкі. *Уладзімір Паўлаў* . . 160
Мы ўсё можам. *Еўдакія Лось* . . . . . . . 161
Развітаемся, званок! *Мар'ян Дукса* . . . . . 162
Гэты цуд завецца — кніга. *(Сцэнарый раніш-ніка.) Маргарыта Яфімава* . . . . . . . . 163
А д г а д к і . . . . . . . . . . . . . . 54

1. Сонца і месяц. 2. Зямля. 3. Гром. 4. Вясёлка. 5. Снег. 6. Цень. 7. Рэха. 8. Дзень. 9. Ноч. 10. Суніца. 11. Крапіва. 12. Павуціна. 13. Венік. 14. Плот.

Вучэбнае выданне

**АКРАЙЧЫК**

**Чытанка для 1—2 класаў**

Укладальнікі

**КАРЖАНЕЎСКАЯ Галіна**
**ЯФІМАВА Маргарыта**

Загадчык рэдакцыі А. А. Дзераш. Рэдактар А. І. Пыльчанка. Мастак А. А. Іванова. Мастацкі рэдактар Л. У. Паўленка. Тэхнічны рэдактар С. І. Ліцкевіч. Карэктар В. С. Бабеня.

Здадзена ў набор 01.12.94. Падпісана ў друк 10.03.95. Фармат $60 \times 90^1/_{16}$. Папера кн.-часопісная. Гарнітура часопісная рубленая. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 11+0,31 форз. Умоўн. фарба-адбіт. 45,5. Ул.-выд. арк. 5,84+0,43 форз. Тыраж 61 550 экз. Заказ 750.

Выдавецтва «Народная асвета» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 4. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Набор зроблены на Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінаце МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўскага, 20.



Калі я шчаслівы

Вечарамі казкі баю





Слухай родную прыроду

Пра ўсё раскажа школа



(1995) АКРАЙЧЫК